Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА

БЕЛАРУСІ

№23
1934 г.

Тав. ЗАЛКОВА—работніца падрыхтоўчага цэха Віцебскай акулярнай фабрыкі, комсамолка, брыгадзір. Яе брыгада сістэматычна перавыконвае промфінплан. Тав. Залкова—лепшая зотаўка. Была дэлегатам Усебеларускага злёта зотаўцаў цяжкай прамысловасці. Абрана дэпутатам Віцебскага горсовета. (Матэрыял глядзі на стар. 9).

Фото С. ГРЫНА

ПАДХАПІЦЬ ВОПЫТ ПЕРАДАВЫХ ЖАНЧЫН-УДАРНІЦ ФІНФРОНТА

З кожным годам усё больш узрастае актыўнасць працоўных жанчын у выкананні фінансавага плана. Шыраюца рады ўдарніц фінансавага фронта, актыўных змагароў за соцыялізм.

Разам з пролетарскім горадам, дзе створан моцны фінансавы актыў на прадпрыемствах і установах, не адстае і калгасная вёска, дзе тысячы жанчын-калгасніц сваёй адданай актыўнай грамадскай работай штодзенна дапамагаюць партыі і ўраду ўзмацняць наша калгаснае будаўніцтва і ператвараць калгасы ў сапраўды большэвіцкія, а калгаснікаў—у заможных.

Работніцы і калгасніцы добра разумеюць, што выкананне фінплана мае гаспадарча-палітычнае значэнне, што без выканання фінплана немагчыма ажыццяўленне велізарнага соцыялістычнага будаўніцтва, якое прадугледжана у другой пяцігодцы, што поўнае выкананне фінансавага плана забяспечыць больш паспяховае развіццё і ўмацаванне бытавых устаноў (яслі, дзіцячыя сады, пляцоўкі і т. д.).

Прывядзем паасобныя прыклады барацьбы, работы ўдарніц фінансавага фронта:

Старшыня фінансавай секцыі Балашэўскага нацыянальна-польскага сельсовета, Рэчыцкага раёна, таварыш **Асецкая Алеся** арганізавала вакол фінансавай секцыі актыў і уцягнула ў фінансавую работу перадавых жанчын-калгасніц і працоўных аднаасобніц, арганізавала соцспаборніцтва і гэтым забяспечыла выкананне фінансавага плана 3-га квартала 1934 года на 153 проц. і выкананне гадавога плана ў верасні месяцы на 83 проц. Па прапанове прэзідыума ЦВК БССР тав. Асецкая прэміравана грашыма ў суме 150 руб. і граматай ўдарніцы фінансавага фронта.

Рад работніц прадпрыемстваў па-большэвіцку правялі кампанію падпіскі на пазыку. Тав. **Хайкіна**—работніца Віцебскай фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі"—рэдактар цэхавай штодзёнкі, мабілізавала рабочых праз газету на 100-проц. ахоп падпіскай.

Свой вопыт работы работніцы перадаюць сваім падшэфным сельсоветам. Напрыклад, тав. **Спевак**—работніца трубаліцейнага цэха завода імя Молатава—выязджала з буксірнай брыгадай у падшэфны Ратамскі сельсовет для дапамогі ў справе выканання фінансавага плана.

На Гомельскім камбінаце „Спартак" работніца тав. **Басіна**—герой першай пяцігодкі—з'яўляецца старшынёй цэхавага камсода. Яна лепшая ўдарніца фінфронта, некалькі разоў прэміравана.

Ёсць рад ударніц фінансавага фронта вёскі, якія арганізоўваюць збор сродкаў па пазыцы другога года другой пяцігодкі. Так, упаўнаважаны Ушацкага местачковага совета, член прэзідыума, **Мозгіна**, масава растлумачальнай работай, праверкай аблігацый у часе выйгрышаў, сабрала па аднаасобнаму сектару 500 руб.

Вялікую работу па збору ўзносаў па пазыцы з калгаснікаў праводзіць тав. Гранчакова Алена (парторг калгаса „Свабода", Рагачоўскага раён. Шляхам сістэматычнай масавай работы, уключышыся ў вытворчы паход імя VII з'езда советаў тав Гранчакова праз калгасныя насценгазеты дабілася поўнага пагашэння калгаснікамі і калгаснікамі запазычанасці па пазыцы ў суме 2 620 руб.

Прыведзеныя факты дастаткова яскрава паказваюць, якую вялізарную актыўнасць праяўляюць ударніцы фінфронта ў сваёй рабоце.

Неабходна яшчэ больш мабілізаваць работніц калгасніц і працоўных жанчын на выкананне фінансавага плана, шырока ўвязваючы гэту работу са справаздачна-перавыбарчай кампаніяй советаў.

Трэба высоўваць лепшых ударніц на кіруючую работу ў фінансавыя органы—ашчадкасы, фінансавыя секцыі, камісіі садзейнічання ашчадспр і дзяржкрэдыту, рэвізійныя, падатковыя і страхавыя камісіі.

Увесь жаночы актыў горада і вёскі павінен быць мабілізаваны на выкананне асноўнай задачы—забяспечыць выкананне кожным раёнам, сельсоветам, калгасам і вёскай ўсяго фінансавага плана 1934 года па ўсім плацяжам да 15-га снежня гэтага года.

Цяпер праводзіцца рад масавых фінансавых кампаній: абвешчаны ЦК КП(б)Б фінансавы паход за высокую якасць фінансавай работы, усесаюзны агляд інспектарамі масавых плацяжоў, масавая праверка на прадпрыемствах і ва ўстановах ахопа падпіскай на пазыку уноў прыбыўшых рабочых і служачых. У гэтых кампаніях працоўныя жанчыны павінны прыняць актыўны ўдзел.

Б. Т. Перэльман.



Сродкі ад нашых пазык ідуць на соцыялістычнае будаўніцтва. На здымку—адзін з новапабудаваных домоў на 54 кватэры у Менску, па Свярдлоўскай вуліцы.

РЭЗАЛЮЦЫІ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б)

Аб адмене картачнай сістэмы па хлебу і некаторых іншых прадуктах

Рэзалюцыя пленума ЦК ВКП(б) па дакладу тав. В. М. МОЛАТАВА, прынятая 26 лістапада 1934 года

I. Шпаркі рост гарадоў і новых прамысловых раёнаў, у сувязі з велізарным размахам індустрыялізацыі СССР, і няўхільны пад'ём добрабыту шырокіх рабочых і сялянскіх мас выклікалі вялікі рост попыту на хлеб і іншыя прадукты, і гэты попыт стаў асабліва хутка ўзрастаць з пачатку першай пяцігодкі. Побач з гэтым узмоцненае развіццё тэхнічных культур, неабходнае для забеспячэння нашай прамысловасці ўласным, совецкім, сельскагаспадарчым сырцом, патрабавала значнага павелічэння снабжэння хлебам сялянскага насельніцтва раёнаў тэхнічных культур. Між тым, у той перыяд калгасаў і соўгасаў было мала, і наша сельская гаспадарка, і, ў прыватнасці, зернавая вытворчасць, знаходзілася на вельмі нізкім узроўні. Пераважаўшая тады дробная, індывідуальная сялянская гаспадарка з яе адсталай тэхнікай і нізкай ураджайнасцю не магла задаволіць узрастаючага попыту гарадоў, прамысловых раёнаў і раёнаў тэхнічных культур. Гэта выклікала ўвядзенне рацыянавання (картачнай сістэмы) у снабжэнні.

Тав. СТАЛІН.

II. Увядзенне картачнай сістэмы па хлебу і іншых прадуктах было не толькі неабходна, але і з'яўлялася на працягу апошніх год важнейшаю ўмоваю паляпшэння снабжэння рабочых. Картачная сістэма снабжэння ў гэты перыяд была асабліва неабходна таму, што, не гледзячы на значна больш высокія цэны вольнага рынку і наяўнасць элементаў спекуляцыі ў гэтай справе, снабжэнне рабочых хлебам праводзілася па цвёрдых дзяржаўных цэнах.

Толькі дзякуючы гэтай сістэме дзяржава пры абмяжованасці сваіх рэсурсаў, магла поўнасцю забяспечыць снабжэнне гарадоў і прамысловых раёнаў, магла забяспечыць пераважнае снабжэнне найбольш важных цэнтраў і ўдарнікаў на вытворчасці, а разам з гэтым забяспечыць снабжэнне хлебам па цвёрдых дзяржаўных цэнах здатчыкаў сельскагаспадарчага сырцу: бавоўны, ільну, пянькі, табаку і інш. у інтарэсах пад'ёму тэхнічных культур і росту загатовак сырцу для прамысловасці.

III. К сучаснаму моманту, калі замест раздробленай дробнай аднаасобнай гаспадаркі ў земляробстве ўмацавалася буйная, механізаваная вытворчасць, калі пануючае становішча ў сельскай гаспадарцы занялі калгасы і соўгасы і калі мы ўжо дабіліся іх значнага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання, становішча карэнным чынам змянілася. Аб гэтым сведчаць не толькі поспехі хлебазагатовак у гэтым годзе, але і асабліва поспехі хлебазакупак, правадзімых дзяржавай па павышаных цэнах. Дзяржава цяпер мае дастаткова вялікую колькасць хлеба для таго, каб поўнасцю і безумоўна забяспечыць снабжэнне насельніцтва без картачнай сістэмы, шляхам паўсямеснага разгортвання шырокага гандлю хлебам. Пры такім становішчы картачная сістэма па хлебу і некаторых іншых прадуктах можа быць толькі тормазам у паляпшэнні снабжэння і таму павінна быць адменена.

Адменай картачнай сістэмы па хлебу будзе зроблен новы важнейшы крок да замены сістэмы цэнтралізаванага размеркавання разгорнутым совецкім гандлем у адпаведнасці з дырэктывамі аб другім пяцігадовым плане, прынятымі XVII партыйнай канферэнцыяй.

IV. Ліквідацыя картачнай сістэмы па хлебу і іншых прадуктах павінна ўстараніць існаванне падвойных цэн (нармаваных і камерцыйных) і забяспечыць устанаўленне цвёрдай і адзінай для кожнай вобласці (рэспублікі) прадажнай дзяржаўнай цаны. Гэта адзіная цана па хлебу і іншых прадуктах павінна быць устаноўлена прыблізна па сярэднім узроўні паміж існуючымі высокімі камерцыйнымі цэнамі і занадта нізкімі нармаванымі цэнамі, з улікам розніцы транспартных і іншых умоў снабжэння паасобных раёнаў. У сувязі з тым, што гэта акалічнасць прывядзе к некатораму павышэнню нармаваных цэн на хлеб, пленум ЦК ВКП(б) лічыць, што павінна быць праведзена адпаведнае павышэнне заработнай платы рабочых і служачых.

V. Адначасова з ліквідацыяй картачнай сістэмы ў гарадах павінна быць поўнасцю адменена нар-

маванае снабжэнне хлебам у парадку так званага „атаваравання“ загатовак сельскагаспадарчага сырцу: бавоўны, ільну, пянькі, табаку і інш. З прычыны некаторага павышэння нармаваных цэн на хлеб, адмена гэтага „атаварвання“ павінна суправаджацца адпаведным павышэннем загатоўчых цэн на бавоўну, лён, пяньку і т. д.

VI. Ліквідацыя картачнай сістэмы і пераход да паўсямеснага шырокага продажу хлеба, а таксама мукі і некаторых іншых прадуктаў павінны суправаджацца шырокім разгортваннем гандлёвай сеткі, як у горадзе, так і вёсцы, усямерным развіццём дзяржаўнага і кааператыўнага хлебапячэння і правільным размяшчэннем хлебных рэзерваў па раёнах снабжэння. Пакідаючы ў сіле ўстаноўлены парадак для калгаснага гандлю, неабходна весці няўхільную барацьбу са ўсякімі спробамі спекуляцыі хлебам і іншымі вылазкамі класавага ворага пры правядзенні данага важнейшага мерапрыемства.

Выходзячы з гэтага, пленум ЦК ВКП(б) прызнае неабходным:

I. Адмяніць з першага студзеня 1935 года картачную сістэму снабжэння хлебам, мукой і крупой і ўстанавіць усюды **шырокі продаж хлеба** і іншых прадуктаў насельніцтву з дзяржаўных і кааперацыйных магазінаў.

II. Адмяніць усе віды існуючых рознічных прадажных цэн на хлеб, муку і крупу і ўвесці адзіныя рознічныя дзяржаўныя цэны на хлеб, муку і крупу прыстасоўна да некалькіх тэрытарыяльных паясоў, якія ўключаюць пэўныя групы абласцей, краёў і рэспублік.

III. У сувязі з адменай картачнай сістэмы і ўстанаўленнем адзіных рознічных цэн на хлеб, муку і крупу, з першага студзеня 1935 года **павысіць заработную плату** рабочых і служачых, стыпендыі студэнтаў і пенсіі пенсіянераў.

Прапанаваць Совету Народных Камісараў СССР вызначыць размеры павышэння заработнай платы для паасобных галін народнай гаспадаркі з улікам захавання пераваг, устаноўленых для паасобных груп і катэгорый рабочых па картачнай сістэме снабжэння.

IV. Адмяніць з першага студзеня 1935 года існуючы парадак **нармаванага водпуску хлеба здатчыкам** сельскагаспадарчага сырцу і разгарнуць шырокі продаж печанага хлеба і мукі ва ўсіх раёнах загатовак сельскагаспадарчага сырцу.

V. У сувязі з устанаўленнем адзінай рознічнай цаны на хлеб і муку, **павысіць загатоўчыя цэны** на сельскагаспадарчы сырэц, за здачу якога дзяржаве адпускаўся дзяржавай калгасам, калгаснікам і аднаасобнікам хлеб па зніжаных цэнах.

Прапанаваць Соўнаркому Саюза ССР устанавіць новыя загатоўчыя цэны на розныя віды і гатункі бавоўны, ільну, пянькі, табаку і т. д. па паясах і раёнах, а таксама ўстанавіць новыя загатоўчыя цэны па паясах і раёнах на махорку, коканы, каракуль, пушніну, шэрсць і рыбу, здаваемую дзяржаве рыбалоўнымі калгасамі.

VI. Устанавіць **шырокі продаж зернафуражу** як для насельніцтва, так і для дзяржаўных, калгасных і кааперацыйных спажыўцоў з дзяржаўных і кааперацыйных складаў і крам па адзіных паясных дзяржаўных цэнах.

VII. Устанавіць, што **продаж печанага хлеба** праводзіцца як праз сетку дзяржаўных і кааперацыйных хлебных магазінаў, так і праз сетку іншых прадуктовых магазінаў дзяржаўнага і кааперацыйнага гандлю, прыстасаваных для продажу печанага хлеба, а **продаж мукі** праводзіцца гандлёвай сеткай дзяржаўнага гандлю, аддзеламі рабочага снабжэння і дзяржаўнымі загатоўшчыкамі, а таксама спажывецкай кааперацыяй з дазволу мясцовых органаў Наркамунутргандля.

VIII. Прыступіць неадкладна да расшырэння дзяржаўнай і кааперацыйнай **сеткі крам** для гандлю хлебам, павялічыўшы гэтую сетку да першага красавіка 1935 г. не менш чым на 10.000 крам, як за кошт даабсталявання і прыстасавання існуючай сеткі крам, так і за кошт пабудовы новых магазінаў і палатак у адпаведнасці з планам, устанаўляемым Соўнаркомам СССР.

IX. Устанаўляць штомесячна планавы водпуск **мукі і крупы** для гандлюючых арганізацый, прамысловасці і іншых дзяржаўных спажыўцоў па абласцях, краях і рэспубліках у колькасцях, забяспечваючых паўсямесны бесперабойны шырокі продаж хлеба і поўнае задавальненне попыту насельніцтва, і стварыць для гэтага зусім дастатковыя запасы мукі і крупы па асобных краях, абласцях і рэспубліках.

Тав. МОЛАТАЎ.

X. Абавязаць мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі прадаставіць памяшканні, неабходныя для разгортвання гандлёвай сеткі па продажу печанага хлеба і мукі, і аказаць усялякую садзейнасць гандлюючым арганізацыям у будаўніцтве новых крам і пякарань.

Ліквідацыя картачнай сістэмы па хлебу і некаторых іншых прадуктах і паўсямесны пераход да шырокага хлебнага гандлю па адзіных цвёрдых дзяржаўных цэнах, а таксама безумоўная магчымасць у далейшым дадатковага зніжэння гэтых цэн і разам з тым зніжэнне цэн на прамысловыя тавары ствараюць спрыяючыя ўмовы для далейшага росту добрабыту рабочых і сялянскіх мас.

Правядзенне гэтага мерапрыемства стала магчымым, дзякуючы перамозе калгаснага ладу ў

вёсцы і ўздыму сельскай гаспадаркі і, у сваю чаргу, яно садзейнічае далейшаму, яшчэ больш быстраму росту сельскай гаспадаркі і прамысловасці на аснове ўмацоўваючагася совецкага рубля і разгортваючагася таваразвароту паміж горадам і вёскай.

Вялікія і складаныя практычныя задачы, што стаяць перад партыяй і рабоча-сялянскай дзяржавай у сувязі з ажыццяўленнем данага рашэння, патрабуюць ад усіх партыйных, совецкіх і прафесіянальных арганізацый патрэбнай арганізаванасці і ўліку мясцовых асаблівасцей у аператыўнай рабоце і разам з тым рашучага адпору ўсім і ўсякім дэзарганізатарскім вылазкам класавага ворага.

Правядзенне гэтага рашэння ў жыццё павінна знайсці сваё адлюстраванне ў далейшым умацаванні саюза рабочых і сялян і ў пабеданосным прасоўванні наперад справы соцыялізма ў нашай краіне.

АБ ПАЛІТАДДЗЕЛАХ У СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ

Рэзалюцыя пленума ЦК ВКП(б) па дакладу тав. Л. М. КАГАНОВІЧА, прынятая 28 лістапада 1934 года

У барацьбе за соцыялістычную перабудову вёскі партыя, сутыкнуўшыся з радам труднасцей, практычна перамагала гэтыя труднасці і знішчала недахопы. У студзені 1933 года, улічваючы буйнейшыя палітычныя, арганізацыйныя і гаспадарчыя недахопы работы ў вёсцы, пленум ЦК ВКП(б) пастанавіў:

„У мэтах палітычнага ўмацавання МТС і соўгасаў, павышэння палітычнай ролі і ўплыву МТС і соўгасаў на вёсцы і рашучага паляпшэння палітычнай і гаспадарчай работы нашых ячэек у калгасах і соўгасах... арганізаваць ва ўсіх машынатрактарных станцыях і соўгасах **палітаддзелы**".

Ускрываючы недахопы нашай работы ў вёсцы, тав. Сталін у сваёй прамове на студзеньскім пленуме ЦК указаў, што „палітаддзелы МТС і соўгасаў з'яўляюцца адным з тых рашаючых сродкаў, пры дапамозе якіх можна будзе знішчыць гэтыя недахопы ў самы кароткі тэрмін".

За прайшоўшыя два гады створана 3368 палітаддзелаў МТС і 2.021 палітаддзелаў соўгасаў. Старанна і персанальна падабраныя Цэнтральным Камітэтам партыі 17.000 работнікаў палітаддзелаў МТС і 8.000 работнікаў палітаддзелаў соўгасаў прарабілі за два гады гіганцкую работу па знішчэнню недахопаў работы ў вёсцы, указаных у прамове тав. Сталіна „Аб рабоце ў вёсцы" і рашэннях студзеньскага пленума ЦК.

У барацьбе з класава-варожымі элементамі за большэвіцкае ўмацаванне калгасаў, за ахову грамадскай, калгаснай і дзяржаўнай уласнасці, за першачарговасць выканання абавязацельстваў перад дзяржавай вакол партыі згуртаваўся шматлікі беспартыйны актыў калгаснікаў. Шырокім фронтам разгарнулася сярод калгаснікаў соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

Партыяй пры дапамозе палітаддзелаў выкрыты і выгнаны ў асноўным з калгасаў і соўгасаў антысовецкія, антыкалгасныя, сабатажніцкія і шкодніцкія элементы, кулакі і падкулачнікі, пралезшыя ў калгасы і соўгасы і „ціхай сапай" прабаваўшыя разлажыць іх з сярэдзіны.

Моцнай, непераможнай сілай сталі калгасы, аб'яднаючыя ў цяперашні час тры чверткі сялянскіх гаспадарак і 90 проц. пасеўных плошчаў. На працягу толькі двух апошніх год, за 1933 і 1934 гады, сельская гаспадарка СССР атрымала 137 тыс. трактароў, 18 тыс. камбайнаў, 63 тыс. конных і трактарных сявярак, 24 тыс. складаных і паўскладаных малатарань, 343 тыс. розных убарачных машын зернавых і тэхнічных культур, 25 тыс. грузавых аўтамабіляў.

Маючыеся к цяперашняму часу 240 тыс. калгасаў, 3.500 МТС і 5.000 соўгасаў маюць у даны момант 281 тыс. трактароў, 33 тыс. камбайнаў, 34 тыс. грузавых аўтамабіляў, 845 тыс. конных і трактарных сявярак, 129 тыс. складаных і паўскладаных малатарань, 2.085 тыс. розных уборачных машын зернавых і тэхнічных культур (лабагрэйкі, сенакасілкі, буракакапалкі, ільноцерабілкі і інш.).

К канцу 1932 года ў сельскай гаспадарцы СССР было сельгасмашын, трактароў і грузавікоў на суму 2 млрд. 500 млн. рублёў. За 1933 і ў 1934 годзе сельская гаспадарка атрымала дадаткова сельгасмашын, трактароў і грузавікоў на 1 млрд. 280 млн рублёў.

Не гледзячы на наяўнасць яшчэ сур'ёзных недахопаў у справе скарыстання сельскагаспадарчых машын у вёсцы, у асаблівасці камбайнаў, за апошнія два гады значна лепш чым у мінулыя гады скарыстоўваюцца большасцю калгасаў і соўгасаў трактары, малатарні, ільноцерабілкі і т. д. Трактарамі МТС праведзена ўсіх работ у пераводзе на ворыва ў 1933 годзе 35 млн. *га* (без малацьбы) і ў 1934 годзе 55 млн. *га*. Камбайнамі ў калгасах убрана ў 1933 годзе 533 тыс. *га*, у 1934 годзе—1 млн. 576 тыс. *га*. Палепшылася якасць сельскагаспадарчых работ (ворыва, праполкі, уборкі і т. д.).

Веснавая сяўба 1934 года праведзена на 15—20 дзён хутчэй чым у 1933 годзе і на 30—40 дзён хутчэй, чым у 1932 годзе.

Не гледзячы на наяўнасць адставання ўборкі і страт пры ўборцы ў радзе раёнаў, уборка 1933 і 1934 гадоў у цэлым па Саюзу прайшла значна лепш мінулых гадоў.

Не гледзячы на неспрыяючыя кліматычныя ўмовы ў радзе раёнаў Украіны, Паўночнага Каўказа і некаторых іншых, па Совецкаму Саюзу ў цэлым сабран ураджай у 1934 годзе не меншы леташняга.

Хлебазагатоўчы план 1933 года выканан на паўтара месяца раней 1932 года, хлебазагатоўчы план 1934 года выканан на паўтара месяца раней 1933 года і на 3 месяцы раней 1932 года.

У сазнанні мільёнаў калгаснікаў укаранілася разуменне першачарговасці выканання сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Лозунг, высунуты партыяй на з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў у лютым 1933 года аб барацьбе за большэвіцкія калгасы і заможнае жыццё калгаснікаў, увайшоў у сазнанне і быт дзесяткаў мільёнаў калгаснікаў і стаў практычнай баявой праграмай мабілізацыі шырокіх мас на ўмацаванне калгасаў на агульны далейшы пад'ём сельскай гаспадаркі.

Усё гэта дасягнута ў рэзультаце правільнай палітыкі партыі, у рэзультаце карэннага паляпшэння практычнага кіраўніцтва вёскай.

Умацаваліся перабудаваныя па вытворчаму прызнаку пярвічныя калгасныя партыйныя арганізацыі. Павысілася рэволюцыйная пільнасць і большэвіцкая ідэйная ўзброенасць вясковых членаў партыі.

На аснове разгортвання работы палітаддзелаў адбылося далейшае прыбліжэнне партыйнага кіраўніцтва к калгасу, к сялу і большая ўвязка партыйна-палітычнай работы з вытворчай работай. Пад уплывам задач, пастаўленых партыяй перад палітаддзеламі, практыкі і прыёмаў работы палітаддзелаў, палепшылася работа не толькі пярвічных партыйных арганізацый, але і райкомаў партыі.

Палітаддзелы, як надзвычайная форма арганізацыі, апіраючыся на сілу і аўтарытэт усёй партыі, на гаспадарчую м гутнасць МТС, дабіліся сур'ёзных поспехаў у справе ператварэння адсталага ўчастка соцыялістычнага будаўніцтва — сельскай гаспадаркі — у перадавы.

Тав. **КАГАНОВІЧ.**

Аднак, вопыт паказаў, што па меры росту задач кіраўніцтва вёскай, палітаддзелы самі па сабе ўжо недастатковы, што для кіраўніцтва ўсёй работай у калгаснай вёсцы—палітычнай, гаспадарчай, культурна-бытавой (школы, бальніцы і т. д.) патрабуецца ўмацаванне нармальных партыйных і совецкіх органаў, ахапляючых усю работу: адміністратыўную, гаспадарчую, культурна-бытавую, фінансавую і т. д. Іменна, улічваючы загадзя гэтыя акалічнасці, XVII з'езд партыі ў прынятым на з'ездзе статуце партыі прадаставіў права Цэнтральнаму Камітэту партыі **„стварыць палітычныя аддзелы... на адстаючых участках соцыялістычнага будаўніцтва, набываючых асабліва важнае значанне для народнай гаспадаркі і краіны ў цэлым, а таксама, па меры выканання палітычнымі аддзеламі сваіх ударных задач, ператвараць іх у звычайныя партыйныя органы, пабудаваныя па вытворча-тэрытарыяльнай адзнацы".**

Устанаўляючы, што стварэнне палітаддзелаў поўнасцю сябе апраўдала і палітаддзелы адыгралі выключна важную ролю ў знішчэнні недахопаў, маючыхся ў вёсцы, што поспехі, дасягнутыя ў справе соцыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, умацавання калгасаў, згуртавання калгаснага актыва і стварэння моцнай асновы партыйнай арганізацыі на вёсцы, паляпшэння работы раённых камітэтаў партыі, высоўваюць неабходнасць **завяршэння** пачатага яшчэ пры ліквідацыі акруг раёнавання і поўнага набліжэння органаў кіраўніцтва да **вёскі,**— пленум ЦК ВКП(б) **пастанаўляе:**

I. Пераўтварыць палітаддзелы МТС у звычайныя партыйныя органы, для чаго зліць палітаддзелы з існуючымі раённымі камітэтамі партыі, асабліва вялікія раёны— разбіць на некалькі новых раёнаў, уліўшы туды адпаведныя палітаддзелы.

II. Кіраўніцтва ўсімі пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі ў раёне ўскласці на раённыя камітэты партыі.

III. У сувязі з ускладненнем работы і з узмацненнем адказнасці райкомаў, устанавіць у буйных сельскагаспадарчых раёнах апрача пасады першага сакратара пасаду другога сакратара райкома.

IV. Стварыць у апараце райкомаў сельгасаддзелы, на чале якіх паставіць, у залежнасці ад канкрэтных умоў работы, першага ці другога сакратара райкома партыі.

V. Устанавіць у кожнай МТС пасаду намесніка дырэктара МТС па палітычнай частцы, на абавязак якога ўскласці палітычнае забеспячэнне паспяховага правядзення ўсіх мерапрыемстваў і пачынанняў дырэктара МТС і выканання функцый сакратара пярвічнай партыйнай арганізацыі работнікаў самой МТС.

VI. Устанавіць, што намеснік дырэктара МТС па палітычнай частцы, будучы непасрэдна падпарадкаваны дырэктару МТС, адначасова падпарадкуецца раённаму камітэту партыі, пад кіраўніцтвам якога ён ажыццяўляе сваю партыйна-палітычную работу.

VII. Лічачы, што ўсе наяўныя работнікі палітаддзелаў павінны быць безумоўна астаўлены на рабоце ў раёнах, прызнаць неабходным іх выкарыстанне ў далейшым:

а) у якасці першых сакратароў новаарганізуемых раённых камітэтаў партыі, або дзе гэта неабходна,—першых сакратароў існуючых райкомаў;

б) у якасці другіх сакратароў райкомаў і загадчыкаў сельгасаддзеламі раённых камітэтаў партыі;

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

9—10 снежня 1934 года адбыўся чарговы пленум ЦК КП(б)Б сумесна з сакратарамі райкомаў КП(б)Б і начальнікамі палітаддзелаў МТС.

Пленум абгаварыў наступныя пытанні:

1. Вынікі лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б) і практычныя мерапрыемствы па ажыццяўленню рашэнняў пленума.

2. Арганізацыйныя пытанні.

Пленум аслабаніў ад абавязкаў члена бюро ЦК КП(б)Б тав. **Закоўскага**—Наркома Ўнутраных Спраў БССР у сувязі з прызначэннем яго для работы ў Ленінградскай вобласці і ўвёў у склад членаў пленума ЦК і членам бюро ЦК КП(б)Б тав. **Леплеўскага**, нова-прызначанага Наркомам Унутраных Спраў БССР.

У склад кандыдатаў у члены ЦК КП(б)Б пленум увёў тав. **Гераўкера**—адказнага сакратара ЦСПСБ.

ЦК КП(б)Б.

в) у якасці намеснікаў дырэктароў МТС па палітычнай частцы;

г) у якасці работнікаў апарата новых райкомаў партыі і райкомаў комсамола.

VIII. Устанавіць, што сакратары райкомаў і намеснікі дырэктароў МТС па палітычнай частцы зацвярджаюцца ЦК ВКП(б) і не могуць быць вызвалены ад работы без згоды ЦК ВКП(б), а інструктары райкомаў зацвярджаюцца абкомамі, крайкомамі і ЦК нацкомпартый.

IX. Ператварыць газеты палітаддзелаў МТС у нова-арганізуемых раёнах у органы райкомаў, а ў існуючых раёнах у залежнасці ад становішча раённых газет або зліць з існуючымі раённымі газетамі, або дапусціць аст ўлення газет, як органаў найбольш магутных МТС.

X. Даручыць палітбюро ЦК закончыць правядзенне гэтай пастановы канкрэтна па кожнай вобласці, краю і рэспубліцы ў паасобку к першаму сакавіка, а ў паўднёвых раёнах СССР да 1-га лютага 1935 года.

XI. Абавязаць абкомы, крайкомы і ЦК нацкомпартый прадставіць у ЦК ВКП(б) к 1—15 студзеня свае канкрэтныя прапановы аб арганізацыі новых раёнаў, аб скарыстанні работнікаў палітаддзелаў і прадставіць на зацвярджэнне ЦК ВКП(б) усіх сакратароў раённых камітэтаў партыі як існуючых, так і нова-арганізуемых райкомаў, а таксама намеснікаў дырэктароў МТС па палітчастцы.

XII. У соўгасах усіх відаў аставіць без змены сістэму палітаддзелаў.

Пленум ЦК ВКП(б) падкрэслівае, што перафармаванне палітаддзелаў узмацняе адказнасць райкомаў, абкомаў, крайкомаў і ЦК нацком артый за паспяховае вырашэнне задачы далейшага ўмацавання калгасаў і выкананне лозунга партыі—зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Партыйныя арганізацыі павінны памятаць, што і ў сучасны момант астаюцца ў поўнай сіле ўказанні, даныя студзеньскім пленумам ЦК (1933 г.) пры арганізацыі палітаддзелаў аб тым, што „**барацьба за далейшы пад'ём сельскай гаспадаркі і завяршэнне яе соцыялістычнай перабудовы з'яўляецца ў сучасны момант важнейшай задачай партыі**".

Не гледзячы на велізарны рост і ўмацаванне гаспадарчай магутнасці калгасаў, не гледзячы на рост актыўнасці калгаснікаў, у калгасах усё яшчэ ёсць многа недахопаў у рабоце, не зломлена яшчэ канчаткова ў радзе калгасаў падрыўная шкодніцкая работа пралезшых у іх кулацкіх элементаў.

У прыватнасці, вопыт хлебазагатовак гэтага года паказаў, што вялікія страты пры ўборцы, адставанне уборкі, малацьбы і хлебазагатовак у радзе раёнаў некаторых абласцей і краёў, побач з дрэннай арганізацыйнай работай і няўмелым скарыстаннем трактароў, малатарань і асабліва камбайнаў, тлумачыцца тым, што класава-варожыя элементы ўсё яшчэ праяўляюць сваю актыўнасць з прычыны палітычнай блізарукасці і папушчэння вясковых комуністаў і нават паасобных работнікаў раёнаў і палітаддзелаў.

Райкомы, абкомы, крайкомы і ЦК нацкомпартый абавязаны скарыстаць зімні пэрыяд для далейшага ўмацавання калгаса , згуртавання беспартыйнага актыва, паляпшэння работы праўленняў і старшынь калгасаў, павышэння ролі і значэння агульных сходаў калгаснікаў, згуртавання іх вакол партыі і далейшага ўмацавання пярвічнай партарганізацыі ў вёсцы.

Пленум ЦК ВКП(б) выказвае ўпэўненасць у тым, што работнікі палітаддзелаў, паказаўшыя сябе ў пераважнай большасці з найлепшага боку, як сапраўды большэвіцкія партыйныя арганізатары і ў новых умовах на рабоце ў райкомах і ў якасці намеснікаў дырэктароў МТС па палітчастцы здолеюць быць дастойнымі тых вялікіх задач, якія ўскладаюцца на іх партыяй.

А. МАНЬКОЎ.

Рабочым, работніцам ф-кі „Герой працы" прысвячаю.

ПЛАВІЛЬНАЯ ПЕЧ*)

(Апавяданне)

Дні ішлі цягуча і сумна. На капітальнае будаўніцтва трэст не адпускаў сродкаў. Аб вылучэнцы Праскоўі кіраўнікі забыліся. Пісалі пастановы, загады аб капітальным будаўніцтве, а канкрэтна нічым не дапамагалі. Сродкі, адпушчаныя на палепшанне ўмоў працы рабочых, пайшлі на рамонт кватэр кіраўнікам, запрошаным дырэктарам на фабрыку і на прэміраванне.

На фабрыцы быў прарыў. Кваліфікаваныя рабочыя перакідваліся на чорныя работы, траціл свой заработак.

— Чаму аб гэтым маўчыш ты, Уткін?—гаварыла сама сабе Праскоўя. І не паспела яна зрабіць вывады, як вясёлы Уткін ускочыў у габінет Праскоўі і пачаў жартаваць:

— Аб рэкордах думаеш Пашка?..

Гэтыя словы балюча кальнулі Праскоўю. Абураная, яна кінула яму:

— На фабрыцы прарыў, а ты жартуеш?

— Згарыш ты, Пашка, заўчасна. Усяго мы з табой не перароблім. Глядзі як квітнее Галя! А ты?..

Не вытрымала Праскоўя, ускіпела:

— Ведаю куды хіліш... Абываталь!

Зразумеў Уткін, што не з таго канца пачаў. Хутка перамяніў тактыку:

— Кінь гарачыцца, Пашка. Не плыві ты супроць вады—захлынешся.

Намёк быў зразумелы. Праскоўя ведала, што ад Уткіна можна было ўсяго чакаць. Гэта прымусіла запытаць:

— Што ты хочаш, Сеня!

— Пашка, любая, пакінем фабрыку... Давай паедзем адсюль.

— Ёсць у цябе розум, Сенька? Кінуць фронт і ўцякаць, як дэзертыры. Не! Не выйдзе гэты нумар!..

— Ну, як хочаш.

І Уткін заплакаў, як малое дзіця. Дзіўным усё гэта паказалася Праскоўі.

— Не думала я, што ты такі. Сорамна, Сенька. Не забывайся, што табе даручана кіраваць партыйнай арганізацыяй фабрыкі.

— Не магу, не магу, Пашка! Засмактала мяне сямейнае балота. Жонка, сама ведаеш—дачка кулака. Я... Я заблытаўся. Дапамагчы мне трэба. Мне патрэбен таварыш у сям'і. І гэтым таварышом можаш быць толькі... ты Пашка.

Невядома дакуль-бы цягнулася гутарка, але брыгадзір Сінічкін усхвалявана ўбег у габінет і сваім прыходам прымусіў Уткіна выйсці. Сінічкін глыбока апусціўся ў крэсла і перадаў Праскоўі паперку, атрыманую ім у канторы. Прачытаўшы, Праскоўя многазначна задумалася:

— Так, значыцца...

— Вось табе і так! Пашкадаваў дырэктар Крумкача. Вядома свой чалавек. З яго адказнасць знялі за плавілку ды на твае плечы перавалілі — вязі Праскоўя Міхайлаўна.

— Не хвалюйся, Мікалай Паўлавіч, вывезем як-небудзь.

— Я ведаю. Калі была-б тальковая цэгла, тады-б вывезлі. Ды ты чытай далей... Абрама Майсеевіча пераводзяць у стары, саломенна цэлулозны.

— Ну, на гэта няхай выбачаюць,—узнялася Праскоўя.—Я зараз у партком пайду, не дапаможа—у гарком паеду.

— Апошняе лепш. Не падабаецца нешта Уткін мне.

— Дарэмна, Мікалай Паўлавіч. Ён-жа член партыі—прыгадала Праскоўя.

— Ва ўсякім разе ён не дапаможа!

— Дык раіце ў гарком паехаць?

— Толькі, даўно трэба было,— пераконваў Сінічкін, — няхай-бы гаркомаўцы на фабрыку заглянулі,—яны-б убачылі...

— А ўсё-ж абыходзіць партколектыў не трэба,—настойвала Праскоўя.

— Ну, калі трэба зайдзі, а толькі ён табе, гэты Уткін, дапаможа, як хвораму кашаль.

VII

Прыехаўшы з гаркома партыі Праскоўя зайшла на кватэру да Сінічкіна і папрасіла яго пайсці разам да Клавы Бярозкінай. Сінічкін не супярэчыў. Ён хутка апрануўся і яны вышлі на двор. Было ўжо цёмна.

Яны не заўважылі, як падышлі да кватэры Клавы. Праскоўя пастукаўшы запытала:

— Можна?

— Калі ласка,—чуўся голас Клавы,—заходзьце, гасцямі будзеце.

Клава прапусціла іх ў светлы ўтульны пакойчык. Першай загаварыла Праскоўя.

— Справа ёсць, Клава. Бяры паперу і пішы.

— Што пісаць?

— У ЦК партыі пішы...

Клава ўзяла паперу, чарніла і старанна пачала выводзіць роўныя літары. Праскоўя і Сінічкін дыктавалі. Паўтары гадзіны пісалі яны заяву. Потым кожны падпісаўся пад ёй, заклеілі ў канверт і надпісалі адрас.

— Ну, я пайду—падняўшыся заявіў Сінічкін.

— Можаце ісці, Мікалай Паўлавіч, толькі не забудзьцеся з'явіцца...

— А што такое?

— З дванаццаці начы пойдзем працаваць. Падрыхтуйце дваццаць рыдлёвак.

Сінічкін і Клава глядзелі ў твар Праскоўі, жадаючы на ім прачытаць сакрэт.

— Можа ты нам раскажаш, Пашка, у чым справа?—не вытрымала Клава. І Праскоўя расказала пра спатканне ў гаркоме з членам партыі. Аб тым, што ён расказаў ёй пра гісторыю адной крэйдавай гары і што гэтую гару патрэбна раскапаць. Гэты чалавек сорак год працаваў на фабрыцы.—А што знойдзем, потым убачыце—скончыла яна.

— Ну добра, значыць я пайшоў.

Хутка за Сінічкіным вышлі Праскоўя і Клава. Яны накіраваліся ў парк. Ён гудзеў рознастайнымі галасамі і смехам моладзі. На лаўцы, што стаяла ля самай рэчкі, спявалі—Галя Любімава і жонка Уткіна—Сарафіна Дзяшовіна. Праскоўя паклікала Галю, нешта ёй сказала, і потым запытала:

---

* Пачатак гл. у № 21, 22 нашага журнала.

— Ідзеш?

— Што я здурнела,—злосна адказала Галя.—Я праводзіла нараду жанчын, галава баліць, дай хоць крыху адпачыць...

Праскоўя і Клава пайшлі далей. Яны сустракалі комсамольцаў і гаварылі ім падтрымаць ініцыятыву па раскопцы крэйдавай гары. Многія хлопцы, дзяўчаты, нават старыя работніцы згадзіліся пайсці на суботнік.

Крэйдавыя горы пачалі сваё існаванне з тае пары, як пабудавалі фабрыку. Горы растуць і падымаюцца ўсё вышэй. Сотні тон крэйдавых адыходаў выкідваецца на двор саломена-цэлулозным заводам. Спакой іх непарушны. Толькі хвалі бурлівай рэчкі ў вясновае разводдзе ахватваюць кавалкі крэйды і ператвараюць яе ў малочнага колеру жыжу.

І вось адну з такіх гор будуць сёння раскопваць рабочыя. У чаканні іх Праскоўя з Клавай прыселі на паламанае махавое кола. Разгаварыліся.

— Сарафіна нешта злуе на мяне,—паведаміла Праскоўя.

— І ёсць за што!

— А за што-ж?—здзіўлёна запытала Праскоўя.

Клава крыху падумаўшы адказала:

— На д'ябала табе здаўся Сенька. Не ведала ты з кім звязацца...

...— Што ты пляцеш?—перабіла Праскоўя.

— Не пляту, а кажу даўно ўжо сказанае людзьмі... Уткін расказвае кожнаму, што... жыў з табой на торфазаводзе і што ты яму не даеш спакою на фабрыцы. Галя мне таксама аб гэтым па сакрэту сказала. Ну, напэўна, яна і жонцы па „сакрэту" расказала. У яе, што ў галаве, то і на языку.

— Клава! І ты верыш гэтым плёткам?

— Мне аб гэтым цяжка сказаць.

— Клава, а мяне гэта не хвалюе—не праўда ўсё гэта... Сенька мне помсціць...

. . . . . .

На суботнік ішлі хлопцы і дзяўчаты. Паперадзе ішоў Сінічкін. Прынеслі рыдлёўкі Праскоўі і Клаве і яны першыя пачалі раскапваць крэйду. Загрукацела гара. Праскоўя была задаволена, але часамі зладзейкай урывалася думка „ці не дарэмна працуем"? Мароз прабягаў па целе.

— Націскай, хлопцы!—Заклікаў Сінічкін.

— Ціснем, дзед, ціснем!—адказвалі бліжэйшыя.

Дзяжурны па фабрыцы, начальнік механічнага цэха Крумкач гэтым часам абыходзіў цэхі. Учуўшы крыкі ля крэйдавай гары, накіраваўся туды. Падышоўшы бліжэй, ён лісліва ўсміхнуўся і запытаў:

— Слановую косць шукаеце?

— Што-небудзь ды знойдзем,—за ўсіх адказаў сеташнік Куркевіч Іван.—Дзед, раскажы байку якую-небудзь.

— Так і быць, слухайце. Жыў быў дзед і баба. Дзеда звалі галавацяпам, а бабу Функцыяналка. Напладзілі яны дзяцей без ліку, без меры. Выраслі яны. Зрабіліся кіраўнікамі аднэй фабрыкі і за што яны ні браліся—справа ні з месца. Адзін піша, а пяць, бывала, перапісвае. Зламалася аднойчы абгарэлая цэгла ў плавільнай печы, а новай не было. Фабрыка кепска пачала працаваць... Было гэта даўно. Старэйшы сын галавацяп памёр. Яго пахавалі. Насыпалі над ім вось гэтую гару. А з кішэні, разнарадку на талькаву цэглу, выняць забыліся. Вось і капаемся мы, разнарадку гэтую хочам адкапаць...

Сінічкін кончыў свой расказ—усе засмяяліся. Не смяяўся толькі Крумкач. Не сказаўшы ні слова, ён павярнуў направа і знік за вуглом саломенна-цэлулознага завода.

— А лоўкую ты, дзед, байку сказаў.—Падтрымаў Іван Куркевіч.

— Ну, даволі, таварышы, націскай!

І зноў урэзаліся рыдлёўкі ў белыя глыбы крэйды. Раптам Клава ўскрыкнула.

— Сюды, сюды, штосьці цвёрдае!

— Давай калы!

— Дружней падкладвай, вось сюды пад край, так, так—раз, два!

— Ёсць!—крычаў Сінічкін.

Гэта быў талькавы камень. Праскоўя ад радасці пачала цалаваць Клаву. Сінічкін з Куркевічам ускочылі на камень і пусціліся ў скокі. Удзельнікі раскопак крычалі „ура".

— Хопіць, хлопцы!—сказаў Сінічкін, выціраючы рукавом успацелы твар.—Давай шукаць далей...

— Так да раніцы было адкапана звыш двухсот каменняў. Пашлі ўдзельнікі раскопак адпачываць. Іх змена вячэрняя. Прышоў Абрам Майсеевіч. Яго спаткалі стомленыя Праскоўя, Сінічкін і Клава. Павялі і паказалі сваю знаходку.

— Хочацца расцалаваць вас, таварышы. Вы... вы... Героі! Пакалоўшы гэтыя глыбы на цэглы, хопіць на дзве плавілкі. Хто вам сказаў пра гэты камень?

— Адзін наш стары рабочы, ён цяпер на пенсіі жыве.

— Якая ўдача—шаптаў ён,—значыцца прыступаеце да рамонта плавілкі. А там... Наперад! На поўны ход!

(Працяг будзе)

ПЕРАВЫБАРЫ ПЕРАТВАРЫЛІСЯ Ў СВЯТА

У часе выбараў у советы па ўсіх выбарчых участках Гомельскага раёна былі арганізаваны аднадзённыя яслі. Яслі забяспечылі 98—100-проц. яўку жанчын на выбары.

Асабліва добра прайшлі выбары у Касцюкоўскім, Яроменскім і Пакалюбіцкім сельсоветах. Усе хаты былі чыста прыбраны, выбелены, упрыгожаны лозунгамі і зелянінай. Адчувалася сапраўднае свята.

Усе жанчыны, у якіх ёсць малыя дзеці, прыносілі іх у аднадзённыя яслі і накіроўваліся на выбарчы сход. У хатах ніхто не заставаўся, акрамя хворых. Толькі піянеры дзяжурылі па ўсяму калгасу і заглядвалі ў хату.

У Пакалюбічах было сапраўднае свята. Весела іграў гармонік.

— Мы абіраем наш сельсовет—казалі калгаснікі,—дык давайце весяліцца. І адна жанчына з калгасу „Чырвоны працаўнік" пусцілася пад гармонік танцаваць.

Алена.

НА ЗЛЁЦЕ ЗОТАЎЦАЎ

З 29-га лістапада па 1 снежня ў Гомелі праходзіў усебеларускі злёт значкістаў „ЗОТ“ цяжкай прамысловасці. Прысутнічала 311 дэлегатаў, з іх работніц 39.

Гэты злёт бліскуча пацвердзіў мудрыя словы нашага любімага правадыра тав. СТАЛІНА: **„галоўнае заключаецца ў тым, каб мець палкае большэвіцкае жаданне аўладаць тэхнікай, аўладаць навукай вытворчасці“.**

Група дэлегатак злёта.

Злёт з'яўляўся яркай дэманстрацыяй перамог нашай партыі ў справе аўладання тэхнікай складанейшых машын рабочымі цяжкай прамысловасці БССР. Злёт паказаў рост вытворчага энтузіязма рабочага класа ў барацьбе за аўладанне ўсімі высотамі тэхнікі.

Здача тэхнічнага экзамена на „выдатна“ ўжо не задавальняе нашых зотаўцаў. Яны змагаюцца за здачу экзамена на значок „ЗОТ“ другой ступені.

Многія рабочыя і работніцы працуюць над складаннем тэхнічных праектаў (поўная распрацоўка тэхналагічных працэсаў сваіх аперацый). Гэта работа пашырае тэхнічныя веды, падымае кваліфікацыю рабочага. Работа па складанню тэхнічных праектаў разгарнулася на Віцебскім заводзе „Чырвоны металіст“.

Комсамолка гэтага завода т. Файнберг—дэлегатка злёта—склала тэхнічны праект і рыхтуецца да здачы экзамена на „выдатна“, на значок „ЗОТ“ другой ступені.

Выдатніцы-зотаўкі Віцебскай акулярнай фабрыкі Залкова, Самцова і іншыя вучацца ў тэхнічных гуртках павышанага тыпу і таксама рыхтуюцца да здачы тэхэкзамена на значок „ЗОТ“ другой ступені.

У дакладах і спрэчках чырвонай ніткай праходзіла адна думка—да першага мая ператварыць усе прадпрыемствы БССР у прадпрыемствы суцэльна-тэхнічнай граматнасці.

* * *

З дакладам аб выніках работы цяжкай прамысловасці БССР за 9 месяцаў 1934 года і практычных задачах тэхвучобы, выступіў народны камісар мясцовай прамысловасці БССР тав. **Балцін.**

Тав. **Балцін** указаў, якое вялікае месца займае цяжкая прамысловасць Совецкай Беларусі ў агульнай прадукцыі.

На працягу першай пяцігодкі і першых гадоў другой пяцігодкі мы пабудавалі рад буйнейшых прадпрыемстваў. Самыя буйныя—гэта Магілеўская шоўкавая фабрыка, Крычаўскі цэментны завод, Белдрэс (Беларуская дзяржаўная раённая электрычная станцыя), Менская ЦЭЦ (цёплаэлектрацэнтраль).

Наша цяжкая прамысловасць абсталявана навейшымі машынамі, якія стаяць на ўзроўні апошніх дасягненняў сусветнай тэхнікі.

Цяпер у цяжкай прамысловасці Совецкай Беларусі занята звыш 20.000 рабочых і работніц, у той час калі да рэволюцыі налічвалася некалькі сот рабочых.

Да злёта перадавыя прадпрыемствы прышлі з вялікімі дасягненнямі. Менскі машынабудаўнічы завод імя Варашылава датэрмінова—17 лістапада выканаў промфінплан 1934 г. Гэта—завод суцэльна тэхнічнай граматнасці. З 566 чалавек, якія павінны былі здаць тэхнічны мінімум, здало 540, з іх 234 чалавека здалі на „выдатна“, а астатнія 306 — на „добра“.

Датэрмінова выканалі промфінплан заводы „Пролетарый“ (Гомель), „Комунар“ (Менск), „Чырвоны металіст“, „Комінтэрн“, акулярная фабрыка (Віцебск), шоўкавая фабрыка (Магілеў) і інш. Шоўкавая фабрыка дае ў гэтым годзе звыш плана прадукцыі на 5 млн. рублёў.

Але ёсць і прадпрыемствы, якія яшчэ і зараз знаходзяцца ў прарыве. Да ліку такіх прадпрыемстваў адносяцца завод ланцугоў Галля, Крычаўскі цементны завод, Асінторф і другія. Праўда, за апошні час толькі завод ланцугоў Галля крыху падцягнуўся і пачаў выконваць промфінплан.

На злёце былі садаклады сакратара Віцебскага гаркома комсамола, дырэктара завода „Пролетарый“ і старшыні фабкома Магілеўскай шоўкавай фабрыкі. Яны падзяліліся вопытам сваёй работы па тэхвучобе і рэалізацыі рабочых прапаноў.

Спрэчкі былі сапраўднай трыбунай абмена вопытам. Рэзка дэлегаты крытыкавалі работу ўсебеларускага бюро „ЗОТ“, якое не кіруе зотаўскімі арганізацыямі на прадпрыемствах.

Вялікім недахопам з'яўляецца тое, што ў спрэчках мала выступала работніц—усяго два чалавека. Гэта сведчыць аб тым, што партыйныя і профсаюзныя арганізацыі на прадпрыемствах не падрыхтавалі работніц да гэтага злёту.

З вялікай прамовай, якая неаднаразова перарывалася апладысментамі, выступіў загадчык прамысловага аддзела ЦК КП(б)Б тав. **Готфрыд.** Гаворачы аб задачах другой пяцігодкі, т. Готфрыд азнаёміў злёт з некаторымі лічбамі соцыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя лічбы выклікалі бурныя апладысменты ўсяго зала.

У канцы злёта прадстаўнік рэдакцыі журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“ правёў нараду з усімі работніцамі-дэлегатамі злёта. Усе яны абяцалі трымаць цесную сувязь з журналам, і дасылаць свае допісы.

У заключэнне злёт прыняў зварот да ўсіх рабочых, работніц і ІТР (інжынерна-тэхнічныя работнікі) БССР.

Е. Элштэйн.

ДЭЛЕГАТКІ ЗЛЕТА АБ САБЕ

НАША БРЫГАДА—СТАЛІНСКАЯ

Працую я на Гомсельмашы (Гомельскі завод сельскагаспадарчых машын) у якасці фармоўшчыцы ўжо 9 месяцаў, а да гэтага часу год працавала шышальніцай.

У першыя часы мне цяжка было асвоіць новую работу. Але мне дапамагла тэхнічная вучоба. Я здала тэхэкзамен на „выдатна“ і атрымала значок „ЗОТ“. Пасля гэтага куды лягчэй стала працаваць. З'явілася ўпэўненасць у рабоце.

Тав. Чайкіна

Ад якасці фармоўкі залежыць і якасць адліўкі дэталей. Гэта мяне абавязвае вельмі ўважліва сачыць, каб не было брака. Па тэхнічнай норме дапушчаецца 5 процантаў брака, а ў мяне бывае—$2^1/_2$—3 проц. За кароткі час маёй работы на прадпрыемстве я два разы была прэміравана.

У брыгадзе—я прафорг. Добрай масавай работай мы дабіліся таго, што ўсе 9 чалавек здалі тэхнічны экзамен на „выдатна“. Брыгада зараз носіць назву—сталінскай брыгады і моцна трымае пераходны чырвоны сцяг парткома завода, за сістэматычнае перавыкананне промфінплана і добрую якасць.

Злёт зотаўцаў мне даў вельмі многа. У далейшым я буду вучыцца ў тэхнічным гуртку павышанага тыпа, які арганізоўваецца на заводзе. Хачу павышаць свае тэхнічныя веды і гэтым самым сваю кваліфікацыю.

Таіса Чайкіна.

БРЫГАДА БУДЗЕ ЗОТАЎСКАЙ

Я працую брыгадзірам падрыхтоўчага цэха Віцебскай акулярнай фабрыкі. Мая брыгада складаецца з 25 работніц. Выконваем мы работу рэзкі і точкі шкла для акуляраў. Гэта работа патрабуе дакладнасці і ведання справы.

У брыгадзе—12 зотавак, астатнія 13 работніц займаюцца ў тэхнічным гуртку. Па вытворчаму паходу імя VII з'езда советаў, мы ўзялі абавязацельства зрабіць усю брыгаду суцэльна зотаўскай. Для гэтага мы прымацавалі да ўсіх работніц, якія займаюцца ў тэхгуртку, зотавак для дапамогі. Сама я рыхтую двух работніц для здачы на значок „ЗОТ“, адначасова перадаю ім свой вопыт работы.

Для павышэння тэхнічных ведаў і кваліфікацыі я займаюся на фабрычных курсах майстроў і брыгадзіраў. Курсы даюць мне вельмі многа па кіраўніцтву брыгадай і па павышэнню маіх тэхнічных ведаў.

Наша брыгада — перадавая на фабрыцы. З гонарам мы трымаем пераходны чырвоны сцяг гаркома комсамола, які атрымалі ў міжнародны юнацкі дзень. Брыгада сістэматычна перавыконвае вытворчыя заданні.

У часе вытворчага паходу мы абавязаліся ўзняць прадукцыйнасць працы на 5 проц., а фактычна ўзнялі на 7 проц.

Працуем па тэхнічнаму промфінплану. Да складання тэхпромфінплана на 1935 год, работніцы брыгады ўнеслі 34 прапановы.

Усе работніцы брыгады ахоплены вучобай, але ёсць такія малапісьменныя, што слаба паспяваюць, напрыклад: Бібіна і Юпатава. Трэба, каб фабком прымацаваў да іх таварышоў для дапамогі.

З недахопаў можна адзначыць тое, што зотавак часта трымаюць на нізкіх разрадах. Напрыклад работніца Войніч—самая кваліфікаваная ў брыгадзе, але яна працуе па другому разраду і яе не вылучаюць на больш высокую кваліфікацыю.

Адміністрацыя фабрыкі павінна ў першую чаргу вылучыць выдатніц на больш кваліфікаваную работу і дапамагчы ўсім зотаўкам больш павысіць свае тэхнічныя веды.

Соня Залкова.

РЫХТУЮСЯ ДА ВЫШЭЙШАГА ТЭХНІЧНАГА ЭКЗАМЕНА

На завод „Чырвоны металіст“ (Віцебск) я паступіла ў 1932 годзе пасля сканчэння фабрычна-заводскага вучнёўства. Працую токарам.

Спачатку некаторыя адсталыя рабочыя паглядвалі на мяне коса. „Куды ёй там—дзяўчыне добрым токарам быць“—пагаварвалі яны. Ды і я сама думала, што ніколі не буду добра-кваліфікаваным токарам.

Першы час я не выконвала нормы, не ведала добра тэхнікі свайго станка. Тут я зразумела, што трэба ўзяцца за вывучэнне тэхнікі. Пачала вучыцца ў тэхнічным гуртку.

Калі быў тэхнічны бой паміж нашым заводам і заводам „Камінтэрн“, акулярнай фабрыкай і палітэхнічнымі майстэрнямі, я таксама прыняла ўдзел. На ўсе запытанні я адказвала на „выдатна“, за што камісіяй была прэміравана.

30-га чэрвеня гэтага года я, першая з дзяўчат завода, здала тэхнічны экзамен на „выдатна“ і атрымала значок „ЗОТ“. Пасля гэтага я пачала перавыконваць промфінплан без брака.

Але гэта мяне яшчэ не задаволіла. Я хацела даказаць, што ў нас у СССР—дзяўчына ў цяжкай прамысловасці не адстае ад рабочага. Моцна ўзялася я за павышэнне і ўдасканаленне сваіх тэхнічных ведаў. Па прыкладу рабочых Маскоўскага завода ў нас разгарнулася работа па распрацоўцы тэхнічнага праекта. Гэта значыць—поўная распрацоўка тэхналагічнага працэса.

Я распрацавала тэхналагічны працэс Шпіндэля да варштата О. З. М., які выпускаецца на нашым заводзе. Зрабіла ўсе чарцяжы. Распрацавала тэхналагічны пра-

Тав. Файнберг

цэс поўнай апрацоўкі дэталей, вылічыла хуткасць рэзання і машыннага часу. Тут я не абышлася без дапамогі майго кансультанта тэхніка Персіна.

Работа над дыпломным праектам дала мне вельмі многа. Я асвоіла тэхналагічны працэс любой дэталі. Магу зараз сама падабраць хуткасць рэзання.

Цяпер я рыхтуюся да здачы вышэйшага тэхнічнага экзамена па дыпломнаму праекту на „выдатна“. Але на гэтым я не застанаўлюся. Буду і далей вучыцца, каб дасягнуць ведаў майстра.

Аня ФАЙНБЕРГ.

Першай здала тэхнічны экзамен

Мне было 15 год, калі я паступіла на Магілеўскую шоўкавую фабрыку. Гэты было ў 1930 г. Спачатку я не выконвала прамфінплан, бо не ведала вытворчасці. Усвядоміўшы гэта я з энтузіязмам узялася за справу аўладання тэхнікай і ўжо праз год

Тав. **Мірэр.**

мяне вылучылі брыгадзірам гаспадарча-разліковай брыгады другой групы матальнага цэха. Акрамя гэтага я з'яўляюся комсамольскім арганізатарам.

З работай я спраўляюся. Першая па нашаму корпусу я ў мінулым годзе здала тэхнічны экзамен на значок „ЗОТ". За добрую работу пяць разоў прэміравалі.

У брыгадзе нашай—25 чалавек. З іх—8 зотавак, 5 здалі тэхнічны экзамен на „добра" і астатнія 12 займаюцца ў тэхнічным гуртку. Мы абавязаліся да VII з'езда саветаў зрабіць усю брыгаду сацэльна зотаўскай. Для гэтага мы прымацавалі больш падрыхтаваных зотавак да адстаючых у тэхвучобе. Зотаўка **Жаройка** ўзяла шэфства над работніцамі: **Землянікай і Закрэўскай.** Я шэфствую над работніцамі: **Клімшавай, Леваненка, Сухавай.** Сама займаюся на курсах майстроў і ў вячэрнім Комвузе.

Наша брыгада штомесячна перавыконвае прамфінплан Мы знізілі брак і кожны месяц маем эканомію па ўсім відам сыравіны і дапаможных матэрыялаў.

Гэтых поспехаў мы дабіліся штодзённай масавай работай сярод работніц. На дзесяціхвілінных сходах мы абгаварваем свае вытворчыя пытанні, чула рэагуем на ўсялякія непаладкі. Праводзім галосную чытку газет і журналаў у часе перапынкаў.

Іда Мірэр.

ЗЛЁТ МЯНЕ МНОГАМУ НАВУЧЫЎ

Пасля сканчэння сямігодкі ў 1931 годзе я паступіла на Менскую цэнтральную электрастанцыю працаваць у якасці памочніка машыніста турбін. На

Тав. **Янкоўская.**

гэтай рабоце працавала два гады. Спачатку 1934 года кіраўніцтва станцыі і цэха вылучылі мяне дзяжурным па трамвайнаму шчыту.

Наша змена сістэматычна перавыконвае прамфінплан і з'яўляецца перадавой на электрастанцыі. Я таксама раўняюся па старым рабочым-ударнікам.

Калі я прыступіла да кіравання складанай замежнай апаратурай і прыборамі ў трамвайнага шчыта, я адчувала вялікую адказнасць. Я зразумела, што мне неабходна асвоіць тэхніку і я пачала вучыцца ў тэхнічным гуртку і рыхтавацца да здачы тэхнічнага экзамена. У маёй вучобе дапамаглі мне ўдарнікі-выдатнікі тт. **Багдановіч і Гнедзенка.** Тэхнічны экзамен я здала на „выдатна" без асаблівых цяжкасцей і атрымала значок „ЗОТ".

На ўсебеларускім злёце „ЗОТ" я пазнаёмілася з вопытам работы перадавых прадпрыемстваў па тэхвучобе. Пасля злёта я пачну вучыцца ў гуртку павышанага тыпа і буду рыхтавацца да здачы тэхнічнага экзамена на значок „ЗОТ" другой ступені. Абяцаю уцягнуць у тэхнічную вучобу астатніх таварышоў па змене, а таксама падрыхтаваць да здачы тэхнічнага экзамена аднаго таварыша.

Рая Янкоўская.

ПАВЫШАЮ СВАЮ КВАЛІФІКАЦЫЮ

Была я раней хатняй гаспадыняй. Мяне цягнула на вытворчасць. Хацелася прымаць актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. І вось у маі 1933 года я паступіла на завод „Пролетары" (Гомель) у чыгунналіцейны цэх. Спачатку працавала прыбіральшчыцай. Прыглядалася да работы шышальніц і праз месяц мяне паставілі на работу каркасніцы (аддзелка провалакі для асновы да шышак).

У студзені 1934 года я пачала наведваць тэхнічны гурток. шышальніц. За добрую паспяховасць мяне яшчэ да здачы тэхнічнага экзамена перавялі на работу ў якасці шышальніцы.

У красавіку гэтага года, калі заводу „Рухавік рэволюцыі" патрэбны былі яшчэ шышальніцы, мяне перакінулі туды. У маі месяцы я здала тэхнічны экзамен на „выдатна" і атрымала значок „ЗОТ". У рабоце я паспявала. Прамфінплан выконвала на 110—115 проц. без брака.

Да XVII гадавіны Окцябрскай рэволюцыі трыкутнік цэха вылучыў мяне на вышэйшую кваліфікацыю—у якасці фармаўшчыцы. На новай рабоце я не адстаю ад рабочых. З першага-ж дня выконваю прамфінплан.

Я запісалася ў гурток павышанага тыпу для зотаўцаў. Буду і надалей працаваць над павышэннем сваёй кваліфікацыі і больш глыбока вывучаць тэхніку.

Марыя Музычэнка.

Тав. **Пекелева**—зотаўка завода імя Ланцуцкага (Гомель)—дэлегат злёта зотаўцаў.

Свінаводчая ферма соўгаса „Александрова“

У 1931 годзе на плошчы ў 990 гектараў, дзе раней не было ніводнага будынка, арганізаваўся соўгас „Александрова“, Клічаўскага раёна. За гэты час у соўгасе пабудавана каля 14 трыццаціпяцікватэрных дамоў, у якіх жывуць рабочыя соўгаса.

У 1932 годзе пры соўгасе арганізавалася свінаводча-таварная ферма ў колькасці 25 свінаматак.

Лепшыя ўдарніцы-свінаркі соўгаса „Александрова“ **Юрчэнка** (справа), **Ціцянкова** (злева).

У 1933 годзе ферма ўжо налічвае 754 свінаматкі, а ў 1934 годзе — 1479. З кожным годам ферма расла выключна за кошт свайго прыплоду. Прыплод 1934 года складае 906 галоў, тады як планавы прыплод парасят галоўя меркаваўся ў 880 галоў. Усё гэта дало магчымасць поўнасцю і своечасова выканаць мясапастаўкі дзяржаве.

Не гледзячы на тое, што соўгас „Александрова“ арганізаваўся нядаўна, ён увесь час ідзе першым па свінатрэсту. За сваю паказальную работу ферма соўгаса „Александрова“ ў дзень ураджаю і калектывізацыі на раённай Клічаўскай выстаўцы атрымала першую прэмію.

Ферма да зімы падрыхтавана: агледжаны сцены, дзверы, вокны свінарніка. Зараз ужо пачалі паліць печы. Свінарнік упрыгожан ёлкамі, на кожным станку вісіць таблічка, дзе паказана назва свінаматкі, вытворца і іх вага. На сцяне вісіць агульны табель працадзён кожнай брыгады і даглядчыцы паасобку, а таксама вага сутачнага прыроста парасят галоўя. Тут мы бачым загады па ад'ёму парасят, распарадак кармлення і т. д.

На ферме працуюць тры брыгады ў колькасці 18 чалавек. Першая матачная брыгада з 4 чалавек даглядае 133 свінаматкі. Брыгадзірам з'яўляецца лепшая ўдарніца **Юрчэнка Дуня**. За захаванне маладняка і выкананне плана пакрыцця свінаматак соўгас тры разы прэміраваў брыгадзіра **Юрчэнка**, даглядчыцу **Каленікаву Аксану** і даглядчыцу другой брыгады — **Ціцянкову Зосю**.

У другой адкормачнай брыгадзе свінаматак 249 штук. Брыгадзірам працуе ўдарніца **Аўтуховіч Макрэнка**. За добры сутачны прырост парасят галоўя, трэст два разы прэміраваў яе—палітом і 150 руб. грашыма. Сутачны прырост старшых груп складае ад 700 грам да 1 кгр., сярэдніх груп — ад 500 да 700 грам, малодшых груп ад 200 да 500 грам.

Кожная даглядчыца добра ведае свой станок і строга выконвае ўсе зоатэхнічныя правілы ў сэнсе трымання чыстаты, падрыхтоўкі і своечасовай раздачы кармоў.

Ферма магла мець яшчэ больш дасягненняў у сваёй рабоце, калі-б не пагаспадарнічала ў ёй рука шкодніка—зоатэхніка Бакуновіча, якога судзілі 2 разы за розныя злачынныя дзеянні ў соўгасах. Але не гледзячы на ўсё гэта, Магілеўскі свінатрэст накіраваў яго ў соўгас „Александрова“. Бакуновіч рабіў усё, каб толькі падарваць работу фермы. З яго ведама рабіўся недакорм матак і недакорм адкормачнага пагалоўя, ён ліквідаваў прагулку свіней і падкормачныя станкі парасят. Падкормка давалася на халоднай вадзе, кармы не запарваліся і несвоечасова рабіўся ад'ём парасят. Гэта прывяло да павелічэння адыхода маладняка. За дзесяць дзён пала 129 штук.

Бачачы, што лепшыя ўдарніцы пачалі выкрываць яго шкодную работу, ён зняў з работы брыгадзіра Юрчэнка Дуню, а таксама імкнуўся зняць з работы Ціцянкову Зосю.

Але дзякуючы пільнасці і чуласці дырэктара **Шармякова** да работніц фермы злачынца быў выкрыт і аддадзен пад суд. Юрчанка зноў прыступіла да работы. Усе работніцы фермы замацавалі сябе на гэтай рабоце да канца другой пяцігодкі.

М. Ю.

У ХАТАХ КАЛГАСНІЦ ЧЫСТА І КУЛЬТУРНА

Раней вёска Раштова была адной з глухіх вёсак Полаччыны. Поўгалоднае, аднаасобнае жыццё асабліва адчувалася сялянкамі. Кожная вясна прыносіла бясхлебіцу. І як-бы жанчына ні старалася пакідаць хлеб да вясны, хаця на палову з мякінай, а ўсё-ж такі да першых праталін—хлеб канчаўся. Потым Раштаўцы чакалі шчаўлю, або прасілі кабальную пазыку ў кулакоў. Усё гэта завяршала бескультур'е. У хатах стаялі свінні, авечкі.

Зусім інакш жывуць Раштаўцы зараз. У вёсцы красуецца калгас „1-е мая“. Усміхнулася радасцю жыццё працоўным жанчынам. Ударніцамі працуюць яны зараз у калгасе, нясупынна паляпшаючы сваё жыццё. Так, былая бяднячка, зараз калгасніца Пілюшэнка Настася, выпрацавала разам са сваім мужам каля 700 працадзён і да пачатку размеркавання ўраджаю ўжо атрымала больш 100 пудоў хлеба. Не менш выпрацавалі і другія калгасніцы: Шэф Прасіння, Лысенкова Маня, Пілюшэнка Ганна. Для іх праца стала справай доблесці і гераізма. За сваю работу яны не аднойчы прэміраваны. Цяпер у кожнай хаце калгасніцы чыста і культурна, амаль у кожнай гаспадарцы ёсць швейная машына, чаго пры аднаасобным жыцці не было.

Не рэдка пачуеш як пяюць песню Янкі Купалы: „Я калгасніца маладая, жыву, а нідбаю“.

М. Яроменка.

Полацкі раён.

КАЛГАСНІЦЫ АДЗНАЧАЮЦЬ ЮБІЛЕЙ ПРАДАЖАЙ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ

(Клічаўскі раён)

21-XI—34 г. адбылася пашыраная нарада жаночага актыва калгаса „Наша праца", Клічаўскага раёна. Жанчыны заслухалі даклад аб святкаванні дзесяцігадовага юбілею журнала „Работніца і калгасніца Беларусі".

У гонар дзесяцігоддзя журнала жанчынамі высунута пра-

* * *

Калгасніцы калгаса „Чырвоны май", нацыянальнага польскага Наталаўскага сельсовета на сходзе жанчын патрабавалі ад праўлення калгаса поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па ільну і 5 цэнтнераў збожжа, якое

Чырвоны абоз са збожжам, арганізаваны калгасніцамі калгаса „Наша Праца".

панова арганізаваць сіламі жанчын чырвоны абоз па продажу дзяржаве збожжа.

Нарада жаночага актыва патрабавала ад праўлення калгаса кожны месяц праводзіць сходы калгасніц, на якіх ставіць пытанні аб жыцці калгаса і інш.

На нарадзе 16 жанчын падпісаліся на гадавую падпіску журнала.

Раніцой 22 лістапада на дварэ калгаса было шумна. Энергічныя рухі калгаснікаў і калгасніц гаварылі аб тым, што кожны спяшаўся штосці зрабіць, каб не спазніцца з адпраўкай жаночага абоза.

Чакаюць жанчыны распараджэння старшыні калгаса Дайнеко, які хутка зачытвае прозвішчы. Сярод іх лепшыя ўдарніцы **Шамаль Варка, Цімаховіч Наста** і іншыя. Усе яны селі на вазы і радасныя ад'язджалі з калгаснага двара. Абозам прададзена дзяржаве тры тоны збожжа.

Ючкова.

лежала калгасу за кантрактацыю ільну і табаку, прадаць дзяржаве.

На сходзе арганізавана жаночая брыгада па лесавывазцы, што дало магчымасць пакінуць мужчын на будаўніцтве, якое разгорнута ў калгасе. Арганізавана самаправерачная брыгада па ўліку працадзён калгаснікаў і па размеркаванню ўраджая 1934 года.

20 калгасніц падпісалася на журнал „Работніца і калгасніца Беларусі" і арганізавалі селькораўскі гурток.

Дубавік Маня на сходзе калгасніц заявіла: „калі я не была калгасніцай, заўсёды купляла хлеб, а зараз маю гонар са сваіх працадзён прадаць 25 пудоў збожжа дзяржаве".

Юркевіч.

БРЫГАДЫ КОБЕЦ ДА З'ЕЗДАЎ

На апошніх двух транспарцёрах у левым баку светлага, чыстага клеельнага цэха фабрыкі „Х Окцябр" працуе лепшая з лепшых—ударная брыгада імя 3-га рашаючага, змены „Б". Брыгада складаецца з 10 чалавек, якія працуюць на 22 машынках знадворных каробак.

Уважліва сочыць брыгадзір **Кобец** за рытмічным ходам машынак. Хутка папаўняе машынкі лучынай. Умела і спрытна перабіраюць работніцы лучыну, асцерагаюць машыну ад пападання ў яе ламанай, бракаванай лучыны, сочаць за правільнай наклейкай паперы на каробкі.

Брыгада тав. Кобец добра аўладала працэсамі сваёй работы. Тав. Кобец умела і добра кіруе работай сваёй брыгады. Таму брыгада сістэматычна выконвае промфінплан колькасна і якасна.

Паглядзіце у зводку брыгады і вы ўбачыце з якімі, сапраўды ўзорнымі, паказчыкамі брыгада сустракае з'езды советаў.

Промфінплан за верасень месяц брыгада выканала на 107,7 проц., за кастрычнік—111,9 проц., у першай дэкадзе лістапада план выканан на 108,2 проц., у другой дэкадзе—118,8 проц.

Паказчыкі выканання плана ўзорныя не толькі па ўсёй брыгадзе цалкам, але і кожнай работніцы паасобку. Так работніца **Сцепаненка М.** выконвае план на 116 проц., **Федарэнка М.**—на 117 проц., **Зелікман Р.**—113,9 проц., **Чыжык М.**—118 проц., **Бандарэнка П.**—107 проц. Сама **Кобец Марыя** выконвае план на 113 проц.

Усе 10 работніц брыгады здалі тэхэкзамен, з іх 6—на „выдатна", 2—на „добра", 2—на „здавальняюча".

— Мы ставім сваёй задачай каб усе работніцы былі выдатніцамі,—гаворыць тав. Кобец,—і мы гэтага дабʻемся, бо у сваёй штодзённай рабоце мы дапамагаем адстаючым у справе асваення тэхнікі варштатаў.

Брыгада Кобец Марыі сапраўды узорная і лепшая ў змене, у яе ёсць чаму навучыцца.

І ВАРОНІНАЙ—СОВЕТАЎ БУДЗЕМ

ДОБРА ПРАЦАВАЦЬ У ГОРСОВЕЦЕ

Прыкладу яе паследвала першая вытворчая эцікеровачная брыгада змены „Б“ (брыгадзір Вароніна), якая зараз сістэматычна выконвае прамфінплан, праграма першай дэкады лістапада выканан ёю на 102 9 проц., другой дэкады—на 100 проц.

Усяго ў брыгадзе працуе 28 работн ц. Паміж імі шырока разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Кожная работніца ў брыгадзе стараецца выперадзіць адна адну і даць найлепшыя паказчыкі. У цэлым брыгада спаборнічае з другой вытворчай эцікеровачнай брыгадай.

Тэхвучобай ахоплены ў брыгадзе усе работніцы. З іх 18 здалі тэхэкзамен на „выдатна“ і астатнія рыхтуюцца да здачы тэхэкзамена—на „выдатна“.

Вялікую дапамогу ў рабоце брыгадзе аказвае прафорг брыгады тав. **Трушава**. З уключэннем у вытворчы паход імя VII з'езда советаў Трушава праводзіць масава-растлумачальную работу ў брыгадзе, мабілізоўвае ўвагу ўсіх работніц на дастойную сустрэчу з'ездаў советаў.

У брыгадзе праводзяцца вытворчыя нарады, на якіх абгаварваюцца ўсе адмоўныя бакі ў рабоце. Напрыклад, у кастрычніку работніца Смольская зрабіла без уважлівых прычын прагул. Брыгада абгаварыла яе ўчынак і за гэта выключыла яе з членаў брыгады. Работніцы Хвалінскай за зроблены брак звыш плана брыгадай вынесена суровая вымова. Зараз такія ўчынкі ў брыгадзе больш не паўтараюцца.

У сувязі з выкананнем экспартнай праграмы 21 лістапада і агульнай гадавой праграмы 26 лістапада на 100 проц. рабочы калектыў фабрыкі ўзяў на сябе абавязацельства да канца года выпусціць звыш плана 30.000 яшчыкаў высокаякасных экспартных запалак.

Абедзве гэтыя брыгады сапраўды — па-большэвіцку змагаюцца за права атрымання фабрыкай рапарту VII з'езду советаў.

М. Белкін.

Рэчыца.

У мінулым **Маня Шыфрына** хадзіла па вуліцах—беспрытульнай. Дні праходзілі ў голадзе і холадзе, не было куды прытуліць сваё сіроцкае жыццё і нікто не хацеў яго зразумець. Але надыйшла Окцябрская рэволюцыя. Змянілася жыццё Шыфрынай. Акрэпшы ў бадзёрым дзіцячым піянерскім калектыве, Маня паступае на вучобу ў фабзавуч пры скураным заводзе „Большэвік“ (Менск).

Скончыўшы фабзавуч яе накіравалі працаваць на завод. Ішлі гады, рос і рэканструяваўся завод „Большэвік“, а разам з ім расла і Маня.

Зараз не пазнаць былую беспрытульную дзяўчынку. Няма больш заплаканых вачэй. З радаснай усмешкай на вуснах яе невысокая тонкая постаць рухава завіхаецца каля варштату.

Прайшло некалькі слаўных год работы на заводзе, выкавалі з яе лепшага ўдарніка—героя першай пяцігодкі і комсамольскага арганізатара другога храмовага цэха.

Шыфрына — зотаўка-ударніца, яна свой прамфінплан выконвае на 120—125 проц., браку у яе няма. Як лепшую кваліфікаваную работніцу яе вылучылі брыгадзірам.

Гэтага прыкладнага арганізатара на вытворчасці рабочы калектыў абраў членам Менскага гарадскога совета.

— Пастараюся апраўдаць назву героя, як на вытворчасці, так і ў горсовеце—гаворыць т. Шыфрына.

* * *

Другі дэпутат **Хвашчэўская Маня**—абрана ў другі раз. На працягу трох з паловай год Хвашчэўская актыўна працавала ў горсовеце. Не было той работы, якая-б прайшла міма яе.

Яна прымала актыўны ўдзел у рабоце жакта. Дзякуючы ініцыятыве адрамантаваны рабочыя кватэры, не мала прылажыла сіл Хвашчэўская, пакуль адрамантавалі дзіцячы сад, бо яна тут сустрэла нячулыя адносіны з боку дырэктара завода, але пры яе ўпартай настойлівасці сад адрамантован і зараз з'яўляецца прыкладным. Хвашчэўская актыўна змагалася з беспрытульнасцю дзяцей. Па яе ініцыятыве абследаван цэнтральны дзіцячы прыёмнік, дзе выявілі антысанітарнае становішча і цэлы рад іншых недахопаў, на што адразу была звернута ўвага.

Тав. Хвашчэўская.

Зараз у цэнтральным прыёмніку беспрытульных дзяцей значна палепшылася становішча і наладжана чыстата.

Шмат прышлося папрацаваць Хвашчэўскай, каб прывесці ў чысты і прыемны выгляд свой цэх. Да гэтага часу на заводзе лічылі, што там, дзе апрацоўваюць скуры, нельга зрабіць чыстату. Аднак практыка паказала, што і на скураным заводзе можна наладзіць чыстату. Зараз не пазнаць першы хромавы цэх, дзе працуе т. Хвашчэўская. Цэх чысты, азелянёны і цёплы.

Тав. Хвашчэўская выконвае грамадскую работу, цесна ўвязваючы з вытворчасцю. Яна добра аўладала тэхнікай вытворчасці і атрымала значок „ЗОТ“.

Такіх людзей абрала рабочая грамадскасць завода „Большэвік“ у горсовет.

Л. Б.

Менск.

СУСТРЭЧА

З. Бандарына

ЧАСТКА III *)

Праз многа год у тым-жа маёнтку рыхтаваліся да радаснай сустрэчы. Пані Альзона, зараз бадай старуха, сама вазілася ў кухні з пірагом. Учора атрымалі тэлеграму ад Ўладыка, які толькі што скончыў інстытут з спецыяльнасцю інжынера-гідролага.

У жыцці пані Альзоны адбылося шмат змен. Гэтаю зімою памерла яе маці, крыху пазней патрабаваў афіцыйнага разводу муж. Справы па маёнтку ішлі дрэнна, і не так даўно былі абвешчаны таргі на яго. Адзінай яе радасцю і надзеяй заставаўся Ўладык, таму вылічваючы кожную хвіліну з трывогай пазірае яна ў кухоннае вакно, адкуль бачны шырокі абсаджаны клёнамі тракт.

Тымчасам напярэдадні ў Варшаве Ўладык з іншымі спецыялістамі, не знайшоўшымі працы ў сваёй краіне,—вёў праз совецка-гандлёвае прадстаўніцтва дамаўленне аб сваёй рабоце па гідралогіі ў СССР. Дамаўленні былі скончаны і Ўладык разам з пані Альзонай рыхтаваўся да ад'езду.

ЧАСТКА IV

Санаторы „Пролетарый" змяшчаўся на ўзгорку ля самага мора. Новая партыя адпачываючых прыбыла, калі канчаўся абед. Падняўшыся з-за стала Альзона Сігізмундаўна заўважыла, як насупраць села новая—стройная кабеціна з гладка зачосанымі сівымі скронямі. Побач Уладык, затрымаўшыся за сталом, аб нечым дамаўляўся са сваёй суседкай, загарэлай, задорнай дзяўчынкай Джэкай. Сэрца Альзоны Сігізмундаўны скаланулася—дзеля яго яна выраклася роднай абстаноўкі, пакінула Польшчу. Ужо два гады жывуць яны ў Совецкім Саюзе. Ўладык на рабоце карыстаецца вялікай пашанай. Ён быў адным з удзельнікаў у распрацоўцы плану канала Масква—Волга. Над ім, не разгінаючыся, праседжваў ён цэлымі начамі. Пад канец хадзіў зусім няпрытомным і дактары настоілі на адпачынку. Разам з ім прыехала і яна ў гэты санаторы, каб пагрэцца пад крымскім сонцам, замацаваць нервы.

Першыя тры дні Ўладык ні на крок не адыходзіў ад сваёй прыемнай мацеры. Пасля аднойчы прыбег усхваляваны, заружавелы і цалуючы руку прасіў прабачыць за тое, што спазніўся, абяцаючы за гэта пазнаёміць з цудоўнай дзяўчынкай—аператарам.

— Разумееш,—з захапленнем тлумачыў ён,—яна вучыцца ў кіноінстытуце, а зараз у нашай санаторыі. Пазнаёміліся мы зусім выпадкова. У яе з сабою фатаграфічны апарат. Яна абавязкова падружыцца з табою.

Уладык стараўся быць па ранейшаму ўважлівым, ласкавым да Альзоны Сігізмундаўны. Аднак, гэта прымала нейкі падкрэслены, ненатуральны характар. Ды хіба можна яго вінаваціць—у яго жыцці гэта бадай першая жанчына. Рана ці позна павінна было гэта прыйсці.

У думках не аднойчы ствараля Альзона Сігізмундаўна вобраз жанчыны, якую пакахае і зробіць сваёю жонкаю яе Ўладык. Не, Джэка ні ў якім разе не апавядае гэтаму вобразу. У яе хлапцоўскія манеры. Цэлымі днямі бегае яна тут у адных трусах. Узбіраецца на высокія кіпарысы, скача па каменням, па скалам. Не, Джэка не адпавядае створанаму вобразу Альзоны Сігізмундаўны.

З гэтымі разважаннямі яна не засынаючы пралежала ўсю мёртвую гадзіну. Потым яна паднялася і, адчуваючы цяжкасць у галаве, накіравалася ў сталовую.

Сеўшы за стол Альзона Сігізмундаўна ўважліва разглядзела прыгожы твар жанчыны з сівымі скронямі, што сядзела насупраць. Яна толькі сёння прыбыла ў гэты санаторый. У яе рухах была нязвычайная прастата і стрыманасць.

Раптам іх вочы сустрэліся.

Абодвым і цётцы Мар'і і Альзоне Сігізмундаўне на момант зрабілася няёмка, штосці далёкае знаёмае ўсплыло ў памяці.

* * *

Цётка Мар'я прыемнай усмешкай сустрэла ветлую, вясёлую дзяўчынку, якая ў мёртвую гадзіну ўпрасіла яе надзець на галаву павойнік і зняла яе ў такім выглядзе на фотакартку.

Скора Джэка шчыра падружылася з цёткай Мар'яй. Старанна прыпасаючы для Джэкі смачнае пірожнае, альбо булачку ад гарбаты, Мар'я вельмі спачувала яе сардэчным справам, а Джэка дужа шчырая і непасрэдная, прыбягаючы пасля званка з парку, любіла шэпатам апавядаць пра свае размовы з Уладыкам.

— Я яго так люблю, так люблю...

— І добра,—адказвала цётка Мар'я,—абодва маладыя, здаровыя, пажэніцеся і шчаслівыя будзеце...

— Дзе там—недаверліва звінеў Джэкін голас—хіба гэта магліва. Ён замежны спецыяліст, яго маці такая арыстакратка. Не, гэта немагліва. Ніколі немагліва. І сумная ад гэтых довадаў яна забіралася пад коўдру і доўга варочаючыся з боку на бок глыбока ўздыхала.

* * *

Праз дзень быў вечар самадзейнасці і Джэка прымусіла цётку Мар'ю праспяваць жніўныя песні.

Альзона Сігізмундаўна таксама была на вечары, і слухаючы Мар'ю прыпомніла гэтыя песні, калі на яе абшарах некалі яна звонкім голасам спявала. Папярэднія здагадкі апраўдаліся. Здарылася самае страшнае для яе. Вось яна сапраўдная Ўладыкава маці. У яе голасе моц і права, яна прышла па свайго сына... Не, гэтага не можа быць.. Яна паднімаецца з месца, шагае да лесліцы... Яна нікому не аддасць Уладыка. Яна занадта многім ахвяравала для яго і зараз адна мае права на яго каханне. Дзесьці далёка звініць смех Джэкі і голас Уладыка. Да іх далучаецца голас песень маці, яны зліваюцца разам і ў іхніх галасах чуецца вера, маладосць і бадзёрасць.

Альзона Сігізмундаўна нерасправнутая кідаецца на ложак, гарачымі далонямі сціскае скроні. Заўтра будзе гаварыць яна з Уладыкам... Заўтра прымусіць яго выехаць адсюль і... можа... можа паставіць пытанне аб звароце ў Польшчу. Судовым працэсам маёнтак можна высудзіць звярнуць, і пачаць зноў ранейшае жыццё....—Але на сэрцы робіцца пуста і холадна, холадна... Чаму так холадна на сэрцы.

---

*) Пачатак гл. у №№—17, 20 нашага журнала.

* * *

У гэты вечар Джэка на цэлую гадзіну спазнілася ў палату і, перабраўшыся праз вакно, ціха падкралася да пасцелі цёткі Мар'і.

Мар'я, усхваляваная поспехам свайго выступлення, таксама не спала. Джэка гарачая, усхваляваная прыльнула да яе шчакі і некаторы час абедзве маўчалі.

Джэке ўсё яшчэ здаецца, што яна ля мора разам з Уладыкам. Вось яны ўзбіраюцца на скалу і абодва крылатыя, шчаслівыя слухаюць мора. Потым Уладык гаворыць пра будучыню, пра сустрэчу з ёю, пра тое, як хацелася перамагчы яму тую адлегласць, што ляжала між імі. Ён прыгадвае, з якой недаверлівасцю перш адносілася да яго Джэка, тую-ж недаверлівасць адчуваў ён у першы месяц свайго прыезду ў СССР. Пасля гэтага знікла. Адданая работа, поўная ініцыятывы заваявала права на давер'е і дружбу. Знікла адчуждзёнасць. І можа гэта не зусім важна, аднак... Уладык расказаў ёй гісторыю свайго дзяцінства. І Джэка не вытрымала каб ад радасці не перабіць яго: значыць гэтая арыстакратка не твая маці... Яна не скончыла, бо Уладык, падхапіўшы яе на рукі, закружыў у паветры...

Цётка Мар'я загаварыла першая.

— Ведаеце — шаптала яна— вось гляджу на вас і ўсё часцей думаю пра сына. Што вышла з яго, ці на карысць пайшло яму панскае выхаванне. Ці сустрэнемся мы калі.—Яна цяжка ўздыхнула дагаварваючы.—Адно ведаю цяпер—яго не вернеш, чужым ён мне будзе...

— Няпраўда... і Джэка, ахопленая разуменнем важнасці гэтай мінуты, спыняецца, прыгадваючы і дапасоўваючы ўсе здагадкі, якія трэба яшчэ праверыць. Але гэта заўтра, заўтра Джэка возьмецца за гэтую справу.

На другі дзень пасля вячэрняй гутаркі Джэка паклікала Мар'ю ў парк. Яны спусціліся ўніз між кіпарысавых прысад да прыгожае вілы, дзе жыла Альзона Сігізмундаўна. Уладык вёў з ёй размову. Яны абодва сядзелі на каменнай лаўцы пад густой квяцістай магноліяй. Абодва былі бледныя і ўсхваляваныя.

— Не, не зраблю гэтага,—гаварыў Уладык,—вы ахвяравалі для мяне дужа многім, вы былі для мяне найлепшай маткай, але... — ён проста глядзеў ёй у вочы,— доўг грамадзяніна патрабуе маёй работы тут. Разумееце, можа гэта з крывёю продкаў, але мне дораг тут кожны камень, кожная нанова пракладзеная дарога. Я адчуваю сябе адказным за пачатую работу па каналу. Я больш усяго на свеце люблю і турбуюся аб яе выкананні.

На момант ён спыніўся. Ля бледнага твару кантрастам вызначаліся вушы ў чырвоных крапінках. У засені шырокай магноліі стаялі знямелыя цётка Мар'я і Джэка, не маючы сілы крануцца з месца; Уладык, не бачучы іх, гаварыў горача, нервова: Не, я ніколі не звярнуся ў Польшчу, там мне няма месца, там я заўсёды быў чужы. Мне заўсёды прыгадвалі мужыцкае паходжанне. З дзяцінства хаваў мару знайсці сваю салдатку маці...

— Уладзік, сынку...—вырвалася з грудзей цёткі Мар'і... Яна кінулася да Уладыка. Рукі яе калаціліся, тулячы да грудзей мокры, бле. ны твар сына. Так доўга стаялі яны не маючы сіл вымавіць слова. зразумець тое, што здарылася зараз.

У Джэкі з'ялі вочы, а на шчаках выступілі кроплі слёз. Зрабіўшы да іх крок яна супынілася, замерла, каб не перашкодзіць. У першую мінуту ўсе забыліся на Альзону Сігізмундаўну. Сцяўшы вусны, бы грозны прывід. паднялася яна з месца і бяс-шумна пайшла ў засень да кручы.

Момант—другі і крык прарэзаў паветра. У гэтым крыку былі—безнадзейная роспач, суровы прысуд над сваёй нікчэмнасцю.

Ратаваць было позна. З мора выцягнулі Альзону Сігізмундаўну ўжо мёртвай. Перажытае яшчэ больш наблізіла Уладыка да Джэкі і зараз ім цяжка было развітацца.

* * *

З калгаса на імя цёткі Мар'і прышло пісьмо. Старшыня калгаса дзяліўся радаснай навінай:— калгас атрымаў чырвоны сцяг за ўборку ўраджая і хлебаздачу дзяржаве. Надыходзіць свята ўраджаю, на яго з нецярплівасцю чакалі Мар'ю. Увечары, перачытваючы пісьмо Уладыку і Джэкі, цётка Мар'я доўга пазірала на іх з радаснай, шчаслівай усмешкай сказала:—Гляджу я на вас, палюбілі вы адзін аднаго, ну і жывіце разам... У вас сваё жыццё, а мяне чакае праца, многа працы ў калгасе. Будзе час— прыязджайце ў госці.

Так вырашыліся апошнія падзеі. Праз некалькі дзён, праводзячы Мар'ю на вакзал, Уладык і Джэка ветліва ківалі хусцінкамі адыходзячаму цягніку, які вёз Мар'ю дамоў, у калгас, да штодзённых клопатаў жыцця.

(КАНЕЦ).

Як жывуць кітайскія тэкстыльшчыцы

(З кітайскага бюлетэня пролетарскіх эсперантыстаў)

Працоўны дзень на кітайскіх тэкстыльных фабрыках працягваецца дванаццаць гадзін. Акрамя гэтага бывае яшчэ звышчасовая работа і ў выходныя дні.

Калі яшчэ да гэтага дадаць час, які траціцца работніцамі на хаду—на фабрыку і назад, прыблізна гадзіны дзве, тры ды яшчэ яе гаспадарчыя працы, то можна лічыць, што ўвесь працоўны дзень кітайскай работніцы раўняецца 18 гадзінам.

Заработак кітайскіх тэкстыльшчыц невялікі. Ёсць работніцы, якія атрымліваюць далар у дзень, але гэта не простыя „работніцы", а лёкаі капіталістаў.

Кожная работніца павінна аддаць палову свайго заработка фабрыцы для таго, каб атрымліваць прадукты з фабрычнай крамы на кніжку. Гэта робіцца для таго, каб прывязаць работніцу да гэтай фабрыкі. Калі яна мяняе месца працы, яна губляе паўмесячны заработак. Гэтая сума ніколі не выдаецца работніцы. Капіталісты адчынена рабуюць работніц. Калі, напрыклад, на фабрыцы працуе дзве тысячы работніц, фабрыкант можа нажыць толькі з гэтых сум каля 10 тысяч даляраў у год.

Калі работніца захварэе, яна нічога не атрымлівае ад фабрыкі. Калі-ж хвароба працягваецца тры месяцы, яна выкідваецца з фабрыкі і застаецца беспрацоўнай.

Цяпер, з прычыны крызіса, тэкстыльныя фабрыкі Кітая ці зусім закрываюцца, ці змяншаюць сваю прадукцыю. Беспрацоўе сярод работніц расце.

Павятовы гарадок*)

Зяма Ільвавараў

(Урывак з паэмы)

Слабыя промні
Вільгаць пілі
Там, дзе выдры
Ды ваўкі.
На горцы сеці
Падсушылі
Да касцей прамоклыя
Рыбакі.
І покуль сонца
Зусім не знікне там,
Будуць сядзець
На беразе яны.
Покуль у горадзе
Не пераклікнуцца
Царкоўныя і касцельныя
Званы.
Кожны раз
Віснуць хмары хмурыя
Над горадам
У непагодны час.
І падымаюць
Ветры буйныя
На Сожы хвалі
Кожны раз.
І на гары
На правым беразе
(Куды цяжка ўзбірацца на кані),
Крыллі распластаў
Дажджлівы верасень,
Калыхаючы сонныя агні.
Бурным раннем
Чуецца ракі вой
І хай толькі
Нагою ступіць
На берагі хадок—
Пахне туманамі
І травой.
Павятовы гарадок.
На глухой вуліцы
Плач ранні,
Жаночых надрываў
Голас тонкі—
Цягне ўдаву ўраднік
За продаж
Самагонкі.
На глухой вуліцы
Загасла
Начная зарніца.
Хтосці сэрца
Людское крануў.
Шэпчуць у сінагозе
Пра аўстрыйскага
Загінуўшага прынца
І пра абвешчаную
Вайну.
З жахам абрываецца
Лісток каляндара.
Выглядаюць вочы
Крывавай даты.
Тады выходзяць
Амаль з кожнага двара
Санлівыя
Салдаты.
Бурным раннем
Чуецца ракі вой
І хай толькі нагою ступіць
На берагі хадок—
Пахне туманамі
І травой
Павятовы
Гарадок.

*) Урывак паказвае малюнак старога дарэволюцыйнага беларускага гарадка.

РАБОТНІЦЫ, ЖОНКІ РАБОЧЫХ, КАЛГАСНІЦЫ, ПРАЦОЎНЫЯ АДНААСОБНІЦЫ!

ВЫПІСВАЙЦЕ, ЧЫТАЙЦЕ І РАСПАЎСЮДЖВАЙЦЕ СВОЙ ЖУРНАЛ

„РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ“

на 1935 год

Выданне ЦК КП(б)Б

„РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ“—
асвятляе на сваіх старонках усе мерапрыемствы партыі і ўрада.

„РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ“—
паказвае на сваіх старонках лепшы вопыт работы прадпрыемстваў, калгасаў, соўгасаў, ударніц-работніц і калгасніц.

„РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ“—
шырока асвятляе культурна-бытавыя пытанні работніц, калгасніц і працоўных аднаасобніц, а таксама змагаецца з рэшткамі старога быта.

„РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ“—
шырокаас ятляе жыццё замежных работніц і працоўных сялянак, арганізоўвае інтэрнацыянальную сувязь між работніцамі БССР і работніцамі капіталістычных краін.

„РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ“—
змяшчае ў кожным нумары вялікі літаратурна-мастацкі матэрыял—апавяданні, вершы, нарысы.

„РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ“—
дае з нумара ў нумар старонку ручной працы—выкрайкі і розных фасонаў.

„РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ“ ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ Ў МЕСЯЦ.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

На 12 месяцаў	4 руб. 80 кап.	На 3 месяцы	1 руб. 20 кап.
„ 6 „	2 „ 40 „	„ 1 „	40 „

Падпіска прымаецца ва ўсіх раённых і гарадскіх аддзяленнях Саюздруку, паштовых аддзяленнях, агенцтвах і лістаносцамі.

Адрас рэдакцыі: МЕНСК, СОВЕЦКАЯ 63, рэдакцыя журнала „РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ“

УВАГА. У выпадку недастаўкі вам журнала вы павінны зараз-жа звярнуцца з квітанцыяй выпіскі ў тое паштовае аддзяленне ці да лістаносца, якім здана падпіска. Адначасова паведаміце аб гэтым і рэдакцыю, з указаннем, дзе здадзена падпіска і нумар квітанцыі.

За правільны догляд і ўтрыманне маладняка і буйнай рагатай жывёлы ў стойлавы перыяд

Уздым сацыялістычнай жывёлагадоўлі ў нашай краіне з'яўляецца неадкладнай задачай сённяшняга дня.

У сучасны момант уздым жывёлагадоўлі павінен быць у цэнтры ўвагі кожнага калгасніка і калгасніцы, якія непасрэдна працуюць у данай вытворчасці (скотнікі, даяркі і цялятніцы).

Рашэнне чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б) гаворыць аб тым, каб ні адзін калгас не быў без таварнай фермы. Адным з момантаў выканання рашэння партыі і ўрада з'яўляецца 100-проц. захаванне здаровага маладняка, а тым, каб з года ў год павялічваць пагалоўе.

На гэты асноўны рэзерв да гэтага часу мала зварачвалася ўвагі і маса лепшага маладняка ад дрэннага догляда і ўтрымання падала, альбо—ішла пад нож.

У 1934 годзе адыход маладняка па асобным раёнам дагэтае недапушчальна высокага процанта. У гэтым сэнсе найбольш характэрным з'яўляецца Касцюковіцкі раён, дзе адыход маладняка ровен 23,1 проц. Амаль тое-ж назіраецца і па другіх раёнах: Бярэзінскі—15,7 проц., Рэчыцкі, 4,2 проц., Гомельскі 16,7 проц.. Дубровенскі—16,9 проц. У 1934 годзе большасць калгасаў, у зімовыя кварталы давалі рэзкае паніжэнне прадукцыйнасці, вялікі адыход пагалоўя і асабліва адыход маладняка.

У чым-жа заключаецца асноўны недахоп правядзення зімоўкі 1934 года, якая адмоўна адбілася на колькасці якасці буйнай рагатай жывёлы, і асабліва маладняка? Па-першае—былі халодныя, цёмныя і брудныя памяшканні, якія не маглі забяспечыць захаванне здаровага маладняка.

Па-другое — недакорм стада з-за безгаспадарчасці, няўмелага і бескантрольнага скарыстання кармавых рэсурсаў. Большасць калгасаў не змаглі рацыянальна скарыстаць корм, адсюль жывёла не атрымоўвала адпаведнага рацыёна. Асабліва мала зварачвалася ўвагі на дачу правільнага рацыёна цельным каровам. Рацыён для іх павінен быць асабліва ўзмоцнен за кошт бялковых і мінеральных матэрый, якія ўплываюць на развіццё плода і атрыманне здаровага прыплода. Зразумела, што пры такой дрэннай пастаноўцы скарыстання кармавой базы, многія калгасы да вясны засталіся зусім без грубых кармоў, не гаворачы ўжо аб канцэнтратах і сочных кормах.

Па-трэцяе—у некаторых калгасах адмоўным момантам мінулагодняй зімоўкі з'яўлялася няправільная расстаноўка людзей ўнутры жывёлагадоўчага цэха. Цякучасць, абязлічка ў арганізацыі працы, асабліва па догляду і ўтрыманню маладняка, прывялі да вялікай страты маладняка.

Жывёлагадоўчыя малочна-таварныя фермы зараз уступаюць у рашаючы перыяд зімняга ўтрымання жывёлы, у прыватнасці, маладога стада.

Патрэбна, каб зіма была сустрэта ва ўсеузбраенні, каб зіма гэтага года была ў калгасах праведзена з усёй большэвіцкай гаспадарчасцю, г. зн., каб 1935 год быў інтэнсіўным вытворчым перыядам жывёлагадоўлі.

Усе недахопы зімоўкі мінулага года ў гэтым годзе трэба папярэдзіць і не дапусціць. Чэрвеньскі пленум ЦК партыі даў разгорнутую праграму аб палепшанні развіцця жывёлагадоўлі. Гэтыя канкрэтныя рашэнні павінны быць пакладзены ў аснову усёй работы правядзення зімоўкі жывёлы ў 1935 годзе.

Першай задачай кожнага калгасніка і калгасніцы у гэтым годзе павінна быць—поўнае забеспячэнне жывёлы цёплым і сухім памяшканнем. З усёй адказнасцю неабходна ўлічыць кожны кілаграм грубага, моцнага і сакавітага карма, забяспечваючы адпаведныя рацыёны і канцэнтраты для ўсіх відаў жывёлы, асабліва для сцельных кароў і маладняка.

Правільна расставіць людзей на ферме, замацаваць за брыгадамі жывёлу, увесці здзельшчыну і заключыць дагаворы на сацыялістычнае спаборніцтва, на лепшы догляд і ўтрыманне жывёлы. Дабіцца больш высокіх паказчыкаў у рабоце жывёлагадоўлі, бяручы прыклад калгаса „Чырвоны работнік", Гомельскага раёна, які дабіўся павышэння удоя з 900 літраў да 1100 літраў малака, палепшыў упітанасць кароў і санітарны стан фермы. Зараз ферма поўнасцю падрыхтавана да зімы, забяспечана цёплымі памяшканнямі і кармамі, поўнасцю ўкамплектавана са свайго пагалоўя і купленых імпартных 50 кароў (Остфрыйскай пароды). Пастаўкі мяса-малака дзяржаве ферма выканала на 100 проц., маладняк 1934 года захаваи поўнасцю.

Такіх паказчыкаў павінны дабіцца ўсе астатнія фермы, шляхам мабілізацыі шырокай увагі калгаснага актыва вакол важнейшых пытанняў догляда і ўтрымання маладняка. Трэба павялічыць клопаты аб сцельнай карове, забяспечваючы яе лепшымі кармамі, перасцерагаючы ад пашкоджанняў, паення халоднай вадой, нядобраякаснага і халоднага карма і т. д.

Дужа часта пры складанні кармавых балансаў і размеркаванні прыбыткаў ад ураджая, калгасы не забяспечваюць сцельных кароў і маладняка канцэнтратамі па нормам, указаным Наркамземам, а часам канцэнтратаў зусім не вылучаюць. Такому настрою патрэбна абвясціць бязлітасную барацьбу і поўнасцю забяспечыць нормы кармоў, асабліва канцэнтратамі. Акрамя таго, неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на выхаванне маладняка малочнага перыяда, забяспечыўшы яго неабходнымі нормамі выпайкі, як цельным, так і знятым малаком.

Малочны перыяд маладняка можа быць доўгім і кароткім у залежнасці ад пароды жывёлы.

Для дробнай жывёлы рэкамендуецца малочны перыяд 2,5 месяца, з нормай выпайкі цельнага малака 120 літраў і знятага 250 літраў.

Для швіцаў і остфрызаў малочны перыяд рэкамендуецца 100—111 дзён з нормай ў 170 літраў цельнага малака як мінімум і 400—450 знятага, а таксама забяспечваць мінеральнымі салямі і канцэнтратамі.

Разам з забеспячэннем цялят адпаведнымі кармамі не трэба забываць і аб самой тэхніцы выхавання маладняка, якая мае выключнае значанне ў справе поўнага захавання здаровага маладняка.

Пад тэхнікай выхавання маладняка трэба разумець наступнае: своечасовае паенне і кармленне добраякаснымі кармамі, поўнае саблюдзенне зоаветправіл, гігіену і т. д.

Пры ўмове поўнага выканання гэтых патрабаванняў (а за іх павінны змагацца ў першую чаргу калгасніцы: даяркі, цялятніцы, а таксама і ўсе калгаснікі) пры пастаноўцы высокай вытворчай працы на жывёлагадоўчай ферме, на аснове соцспаборніцтва і ўдарніцтва, задачы развіцця жывёлагадоўлі, правядзення лепшай зімоўкі і поўнага захавання маладняка—калгаснае сялянства выканае з гонарам.

МАНАХАВА

Кошт асобнага нумара 20 кап.

1964 г.

1291

РУЧНАЯ ПРАЦА

Мал. ВЫСЕВКІ

Тлумачэнне да выкрайкі лыжнага касцюма

На малюнку паказан спачатку агульны выгляд касцюма (спадніца і кофта), які шыецца з бумазею, або з другой якой-небудзь цёплай матэрыі.

Далей паказана выкрайка і выгляд лыжніцы ў касцюме.

Крой спадніцы і кофты робіцца асобна. Пасак, манжэты, бакі, кішэні, а таксама барты, патрэбна страчыць шырокім швом. Спадніцу трэба кроіць з двух палотнішчаў узятых разам, на малюнку-ж паказана адна палова спадніцы.

Пункцірам паказана, на якой адлегласці патрэбна прышываць кляпкі з прарэзкамі для таго, каб магчыма было зрабіць шаравары.

Перад і зад спадніцы не сшываюцца, а робяцца на кнопках, для таго, каб можна было камбініраваць. Упорадзе спадніцы патрэбна прышыць гузікі, як паказана на малюнку.

Каб зрабіць выкрайку патрэбна ўзяць ліст газетнай паперы, прыблізна 50 × 20 сант. і скласці ўдвое (спінка), а потым адмерыць згодна размеру і зрабіць урэзкі. Перад патрэбна кроіць, як і спадніцу, з двух кавалкаў, накладаючы адзін на другі.

Выкрайка зроблена на сярэдні ўзрост і зменшана ў 10 разоў ад натуральнай велічыні.

Выданне ЦК КП(б)Б

Ч. в. а. адказнага рэдактара Г. М. АЛЯКСЕЕВА

Адрас рэдакцыі: Менск, Совецкая 63, 3-ці наверх, 11-ты пакой. Тэл. 22-415.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 1364. Тыраж 18.450. Уп. Галоўлітбела № А—5177.

Здана ў набор 7-XII—34 г. Падпісана да друку 14/XII—34 г. У нумары 2½ арк. 120 140 друк. знакаў.